# ДЗІЦЯЧЫЯ БІБЛІЯТЭКІ

Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

2023



ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»
Аддзел бібліятэказнаўства

# ДЗІЦЯЧЫЯ БІБЛІЯТЭКІ. 2023

*Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь*

Віцебск, 2024

УДК 027.84

ББК 78.347.241 (4Беи-4Вит)

Д43

Складальнік *І. М. Пчалова*

Рэдакцыйная калегія: *Н. А. Пугачова*

Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Дзіцячыя бібліятэкі. 2023 : інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь / ДУ ”Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна“, Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. І. М. Пчалова]. – Віцебск, 2024. – 58 с.

У выданні прадстаўлены агляд дзейнасці дзіцячых бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры ў Віцебскай вобласці на аснове форм статыстычных і інфармацыйных справаздач цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм рэгіёна па выніках 2023 года. У бюлетэні адлюстраваны аналіз асноўных паказчыкаў і напрамкаў дзейнасці дзіцячых бібліятэк.

Бюлетэнь таксама ўключае аналітычныя матэрыялы па розных напрамках сацыякультурнай дзейнасці дзіцячых бібліятэк: краязнаўча-патрыятычнаму выхаванню, эстэтычнаму выхаванню, выхаванню экалагічнай культуры і здаровага ладу жыцця, сямейнаму і духоўнаму выхаванню, а таксама арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі ў рэгіёне.

Выданне прызначана для бібліятэчных работнікаў, кіраўнікоў органаў кіравання культурай і ўсіх, хто цікавіцца развіццём бібліятэчнай справы ў вобласці.

© ДУ ”Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна“, 2024

**ДЗІЦЯЧЫЯ БІБЛІЯТЭКІ. 2023**

Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

Складальнік **Пчалова** Ірына Мікалаеўна
Адказны за выпуск Т. М. Адамян
Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай
Мастацкае афармленне А. П. Міклушова

Надрукавана на ксераксе ДУ ”Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна“
210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: metodic@mail.vlib.by

# ЗМЕСТ

**АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗМЕСТ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ДЗІЦЯЧЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 2023 ГОДЗЕ** 4

**САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ. ФОТАФАКТ** 31

**ДАДАТКІ** 34

Ддатак 1. Дзіцячыя бібліятэкі Віцебскай вобласці 34

Дадатак 2. Асноўныя паказчыкі дзейнасці дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці за 2023 год 36

*Карыстальнікі* 36

*Дакументавыдача* 37

*Наведванні* 38

*Бібліятэчны фонд* 39

*Адносныя паказчыкі. Кадры* 40

Дадатак 3. Кантактныя даныя 41

Дадатак 4. Сацыякультурная дзейнасць 45

Дадатак 5. Прадстаўніцтвы дзіцячых бібліятэк у сацыяльных сетках 46

Дадатак 6. Клубы, гурткі і аматарскія аб’яднанні 49

Дадатак 7. Лялечныя тэатры, тэатры кнігі 52

Дадатак 8. Мэтавыя праграмы (праекты) 53

# АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗМЕСТ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ДЗІЦЯЧЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 2023 ГОДЗЕ

Даступнасць бібліятэчных паслуг, у першую чаргу, забяспечваецца рацыянальным размяшчэннем сеткі бібліятэк на тэрыторыі рэгіёна. Па справаздачных дадзеных на 01.01.2024 года абслугоўваннем дзяцей і падлеткаў у Віцебскай вобласці займаюцца **25** дзіцячых бібліятэк. За 2023 год сетка дзіцячых бібліятэк скарацілася на 1 адзінку (на 01.01.2023 г. – 26). Філіял ”Дзіцячая раённая бібліятэка“ ДУК ”Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“ рэарганізаваны з 01.07.2023 года ў сектар па абслугоўванню дзіцячага чытача цэнтральнай раённай бібліятэкі (загад аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бешанковіцкага райвыканкама № 19 ад 16.06.2023 г.). Абслугоўваннем дзіцячага карыстальніка ў тым ліку займаюцца абласная бібліятэка, 23 цэнтральныя бібліятэкі, 32 гарадскія, 18 гарпасялковых і 288 сельскіх бібліятэк.

Галоўнай задачай бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей і падлеткаў застаюцца прасоўванне кнігі і чытання, павышэнне чытацкай актыўнасці. Дзейнасць бібліятэк вядзецца ў рамках выканання дзяржаўнай праграмы ”Культура Беларусі“ на 2021–2025 гады (зацверджана пастановай Савета Міністраў ад 29.01.2021 г. № 53), а таксама плана мерапрыемстваў па правядзенні Года міру і стварэння (адпаведна Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 1 ад 01.01.2023 г. ”Аб аб’яўленні 2023 года Годам міру і стварэння“). Актуальнымі па-ранейшаму застаюцца напрамкі:

– захаванне культурнай і кніжнай спадчыны, традыцыйных каштоўнасцей;
– адраджэнне лепшых традыцый дзіцячага і сямейнага чытання;
– падтрымка культурнага і творчага развіцця дзяцей і падлеткаў праз аматарскія аб’яднанні;
– духоўнае, маральнае, прававое, экалагічнае, эстэтычнае выхаванне дзяцей і падлеткаў;
– фарміраванне ў дзяцей грамадзянскай самасвядомасці і патрыятызму;
– абуджэнне і развіццё ў дзяцей і падлеткаў цікавасці да гісторыі і культуры роднага горада або вёскі;
– стварэнне пазітыўнага вобраза дзіцячых бібліятэк як цэнтраў дзіцячага чытання і дзіцячай кнігі;
– папулярызацыя здаровага ладу жыцця, прафілактыка правапарушэнняў;
– рэалізацыя мэтавых праграм і творчых праектаў;
– праца з карыстальнікамі з абмежаванымі магчымасцямі здароўя і дзяцьмі, якія засталіся без апекі бацькоў;
– арганізацыя змястоўнага вольнага часу дзяцей і падлеткаў з дапамогай аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах.



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 63 | | **”К книге – через театр кукол“** *(праграма)* | літаратурна-эстэтычны | 2019–2023 |
| 64 | | **”Дорога добра“** *(праграма)* | духоўна-маральны | 2020–2023 |
| 65 | | **”Книжный сад“** *(праграма)* | літаратурны | 2022–2025 |
| 66 | | **”Тебе о праве и право о тебе“** *(праект)* | прававы | 2023–2027 |
| 67 | | **”Правила движения достойны уважения“** *(праект)* | прававы | 2023–2027 |
| 68 | | **”Работать творчески, отдыхать активно, жить долго“** *(праект)* | здаровы лад жыцця | 2023–2027 |
| 69 | | **”Выбор профессии – выбор будущего“** *(праект)* | прафарыентацыйны | 2023 |
| 70 | | **”Да лепшых скарбаў дакраніся“** *(праект)* | папулярызацыя беларускай культуры | 2023–2027 |
| 71 | | **”Литературные каникулы“** *(праект)* | дасугавы | 2023–2027 |
| 72 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А.С. Пушкіна | **”Пушкин – XXI век – Новополоцк“** *(праграма)* | літаратурны | 2016– |
| 73 | | **”Солнышко“** *(праграма)* | дасугавы | 2003– |
| 74 | | **”Росток“** *(праграма)* | папулярызацыя кнігі і чытання | 2006– |
| 75 | | **”Беларуская чытанка“** *(праект)* | папулярызацыя беларускай культуры | 2021–2023 |
| 76 | | **”Нескучное искусство“** *(праект)* | эстэтычны | 2023 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 48 | | **”Ты хочаш міру? Памятай пра вайну“** *(праект)* | патрыятычны | май–ліпень 2023 |
| 49 | філіял ”Новалукомльская гарадская бібліятэка“ | **”ПУП“** (Познавательно. Увлекательно. Полезно) *(праграма)* | літаратурны | 2021–2023 |
| **Шаркаўшчынская ЦБС** | | | | |
| 50 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | **”Сэрцам адданыя роднай зямлі“** *(праект)* | патрыятычны | 2022–2025 |
| **ЦБС г. Віцебска** | | | | |
| 51 | Бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча | **”Нам засталася спадчына“** *(праграма)* | краязнаўчы | 2000– |
| 52 | | **”Радзіма мая дарагая, красуйся і ў шчасці жыві!“** (рэалізуецца разам з Першамайскай раённай арганізацыяй г. Віцебска ”Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў“) *(праект)* | патрыятычны | 2023– |
| 53 | Бібліятэка-філіял № 11 імя М. Лынькова | **”Усё пачынаецца з сям'і“** *(праграма)* | сямейнае выхаванне | 2006– |
| 54 | | **”Листая страницы календаря“** *(анлайн-праект)* | адукацыйны | 2023– |
| 55 | Бібліятэка-філіял № 9 імя С. Маршака | **”Увайсці ў свет прыгажосці“** *(праграма)* | эстэтычны | 2016– |
| 56 | | **”Доброе сердце“** *(праект)* | дасугавы | 2023– |
| 57 | | **”Через театр кукол – в мир книги!“** *(праект)* | літаратурны | 2023– |
| 58 | | **”Віцебшчына: гісторыя і сучаснасць“** *(праект)* | краязнаўчы | 2023– |
| 59 | Бібліятэка-філіял № 12 імя М. Астроўскага | **”Юный патриот“** *(праект)* | патрыятычны | 2023– |
| 60 | | **”ЭкоДетки“** *(праект)* | экалагічны | 2023– |
| **ЦБС г. Наваполацка** | | | | |
| 61 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака | **”Дети. Экология. Книга“** – экалагічна-інфармацыйны цэнтр *(праграма)* | экалагічны | 2004– |
| 62 | | **”Кругозор“** *(праграма)* | інфармацыйны | 2009– |



Праца дзіцячых бібліятэк па арганізацыі культурна-дасугавай і асветніцкай дзейнасці традыцыйна вядзецца ў адпаведнасці з календаром знамянальных і памятных дат. У бібліятэках рэгулярна праводзяцца мерапрыемствы, прысвечаныя важным грамадска-значным датам і падзеям, а таксама юбілейным датам вядомых пісьменнікаў.

Паводле звестак Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Віцебскай вобласці, у рэгіёне на 1 студзеня 2023 года пражывала **196 871** дзіця ва ўзросце да 18 год, што склала **18,0%** ад агульнай колькасці насельніцтва (**1 091 948**). У гарадской мясцовасці пражывала **161 430** дзяцей, у сельскай мясцовасці **35 441** дзіця.

Бібліятэка на працягу года актыўна выконвала свае асноўныя функцыі – далучэнне дзяцей да чытання, да інфармацыйнай культуры, спрыяла развіццю асобы дзіцяці, арганізоўвала вольны час дзяцей. Бібліятэкай праводзіліся мерапрыемствы ў дапамогу патрыятычнаму, прававому, маральнаму, эстэтычнаму, экалагічнаму выхаванню падрастаючага пакалення. Колькасць зарэгістраваных карыстальнікаў дзіцячых бібліятэк склала **72 769** чалавек (у 2022 годзе – 73 378 тыс.). Доля дзіцячай чытацкай аўдыторыі ва ўзросце да 18 год склала **64 051** чытачоў, што ў працэнтных суадносінах складае **32,5%**. Карыстальнікам было выдадзена **1 226 740** экзэмпляраў дакументаў (у 2022 годзе – 1 250 562 экз.). У тым ліку дакументавыдача чытачам ва ўзросце да 18 год склала **971 298** экзэмпляраў дакументаў.

Колькасць бібліятэчных мерапрыемстваў у справаздачным перыядзе склала **4 207**, што на 267 мерапрыемстваў больш (6,3%), чым у 2022 годзе. Сярэдняя колькасць мерапрыемстваў дзіцячых бібліятэк вобласці на 1 бібліятэку ў год – 168. Самая вялікая колькасць мерапрыемстваў на 1 бібліятэку фіксуецца ў дзіцячай бібліятэцы Браслаўскай ЦБС (283), дзіцячых бібліятэках ЦБС г. Наваполацка (249) і дзіцячых бібліятэках Полацкай РЦБС (248).

У 2023 годзе колькасць наведванняў склала **547 286** адзінак (у 2022 годзе – 546 762 адзінкі). Працэнт выканання планавага паказчыка па наведваннях дзіцячымі бібліятэкамі Віцебскай вобласці быў выкананы на ўзроўні **100,7**%. Па выніках справаздачнага года актыўнасць наведвання (наведвальнасць) склала **7,4** (у 2022 годзе – 7,5), чытальнасць – **16,9** (у 2022 годзе – 17,1), абарачальнасць фонду – **1,6** (у 2022 годзе – 1,5).

У 2023 годзе агульны аб'ём новых паступленняў у фонды дзіцячых бібліятэк вобласці склаў **25 015** асобнікаў (у 2022 годзе – 26 096). У сярэднім кожная бібліятэка за справаздачны год атрымала тысячу экзэмпляраў дакументаў. Выбыццё дакументаў з фондаў дзіцячых бібліятэк за справаздачны перыяд склала **59 956** экзэмпляраў (у 2022 годзе – 46 851). Гэта **7,7%** ад сукупнага фонду дзіцячых бібліятэк. Выключэнне з фонду адбываецца галоўным чынам за кошт спісання (пераразмеркавання) выданняў, звязанага з працягам працэсу закрыцця бібліятэк.

Сумарны аб'ём фонду дзіцячых бібліятэк на 01.01.2023 года склаў **778 122** дакументаў (у 2022 годзе – 811 540). У сярэднім фонд адной бібліятэкі склаў **31,1** тыс. экз. дакументаў. Аналіз адносных паказчыкаў

складу фонду дзіцячых бібліятэк, у тым ліку з разліку на аднаго карыстальніка, паказвае, што кнігазабяспечанасць у дзіцячых бібліятэках Віцебскай вобласці адказвае базаваму паказчыку і складае 10,7 экзэмпляраў (рэкамендуемы нарматыў – 8–12 экз. дакументаў на аднаго карыстальніка). У трох дзіцячых бібліятэках кнігазабяспечанасць склала менш рэкамендаванага нарматыву: Лепельская ЦБС (7,7 экз.), Полацкая РЦБС (6,4 экз.), Шумілінская ЦБС (7,7 экз.). Абнаўляльнасць фондаў дзіцячых бібліятэк – **3,2%**. Рэкамендуемы нарматыў абнаўляльнасці фондаў складае не менш як 5% ад агульнага аб'ёму фонду ў год. Яму адпавядае толькі абнаўляльнасць фонду дзіцячай бібліятэкі Верхнядзвінскай ЦБС (6,1%).

Па выніках 2023 года персанальнымі камп'ютарамі забяспечана **25** дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці (**100% камп'ютарызацыя**). Агульная колькасць камп'ютараў склала **89** адзінак. У сярэднім па вобласці на 1 дзіцячую бібліятэку прыходзіцца **3,6** камп'ютары. Доступ да інтэрнэту і электронную пошту маюць усе дзіцячыя бібліятэкі.

Праца бібліятэк ў сацыяльных сетках – гэта неабходны напрамак дзейнасці ў нашы дні, яна дапамагае атрымліваць адваротную сувязь ад чытачоў, прасоўваць паслугі, папулярызаваць кнігі, мерапрыемствы і іншыя напрамкі дзейнасці ўстановы, спрыяе зносінам карыстальнікаў з бібліятэкарамі і адзін з адным. Трэба адзначыць, што **19** дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці маюць свае прадстаўніцтвы ў сацыяльных сетках, што складае **76%**. Не задзейнічанымі ў сацыяльных сетках застаюцца 6 дзіцячых бібліятэк: дзіцячая бібліятэка Браслаўскай ЦБС, Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1, Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1, Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 Талачынскай ЦБС, Новалукомльская дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 Чашніцкай РЦБС, Бібліятэка-філіял № 10 імя Я. Коласа ЦБС г. Віцебска. Рэкардсменам па колькасці падпісчыкаў сярод дзіцячых бібліятэк з'яўляецца Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Верхнядзвінскай ЦБС (https://www.Instagram@child_library.vdvinsk). Яе акаўнт у Instagram на канец справаздачнага года налічваў 670 чытачоў. У дадатку, кожная публікацыя профіля набірае ў сярэднім больш за 30 падабаек. Неабходна падкрэсліць таксама працу дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 1 Лепельскай ЦБС (https://www.instagram.com/detskayabibl_lepel), якая мае 520 падпісчыкаў і больш чым за 280 публікацый. Заслугоўвае ўвагі старонка дзіцячай бібліятэкі імя Л. Талстога Полацкай РЦБС (www.instagram.com/detbibl.tolstoy.polock ). Яна налічвае 470 падпісчыкаў і 520 унікальных пастоў. Такім чынам, работа, якая праводзіцца ў гэтай сацыяльнай сетцы, заклікае падрастаючае пакаленне да больш актыўнага наведвання, дзе кантэнт успрымаецца прасцей, а сам фармат публікацый – больш зразумелым і блізкім сучасным дзецям.

Дзіцячыя бібліятэкі актыўна ўдзельнічалі ў сеткавых акцыях, конкурсах і флэшмобах раённага, рэгіянальнага, усерасійскага і міжнароднага маштабу: юбілейная акцыя ”Reading-локация ”Новая земля“ – читают современники“ да 100-годдзя першага выдання паэмы Я. Коласа



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | культуры, мовы, літаратуры | |
| 34 | | **”Мы за здоровый образ жизни!“** *(праграма)* | здаровы лад жыцця | 2022–2025 |
| 35 | | **”В гостях у Мэри Поппинс“** *(праграма)* | эстэтычны | 2022–2023 |
| 36 | | **”Ступеньки“** *(праграма)* | папулярызацыя чытання | 2022–2023 |
| 37 | | **”Расти в безопасности“** *(праграма)* | прававы | 2022–2023 |
| 38 | | **”Закон изучают дети“** *(праграма)* | прававы | 2022–2023 |
| 39 | | **”БиблиоPUZZLE“** *(праект)* | цэнтр чытання і актыўнай творчасці | 2022–2023 |
| 40 | | **”Веселое Новогодье“** *(праект)* | дасугавы | 2022–2023 |
| 41 | Дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы – філіял № 6 | **Праект лялечнага тэатра ”Теремок“** | эстэтычны | 2023 |
| | | **Пастаўская ЦБС** | | |
| 42 | Раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі – філіял № 1 | **”Детишки + книжки“** *(праект)* | адукацыйны | 2022–2024 |
| | | **Сенненская ЦБС** | | |
| 43 | Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1 | **”Міласэрнасць“** *(праект)* | сацыяльная рэабілітацыя дзяцей-інвалідаў, арганізацыя вольнага часу | 2020–2023 |
| | | **Талачынская ЦБС** | | |
| 44 | Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 | **”Пачытаем, адпачнём – лета добра правядзём“** *(праграма)* | літаратурны | 2023 |
| 45 | | **”Талачын – рамонак у вянку Беларусі“** (да 590-годдзя згадкі ў летапісах горада Талачын) *(праект)* | краязнаўчы | 2023 |
| | | **Чашніцкая ЦБС** | | |
| 46 | філіял ”Чашніцкая раённая дзіцячая бібліятэка імя Янкі Журбы“ | **”Свет вакол нас“** *(праграма)* | экалагічны | 2021–2024 |
| 47 | | **”Летнія чытанні – цікавыя падарожжы і прыгоды“** *(праект)* | дасугавы | чэрвень – жнівень 2023 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 16 | | **”Мова родная, мова модная“** *(праект)* | папулярызацыя чытання | 2023– |
| 17 | | **”Кніга пачынаецца з пісьменніка“** *(праект)* | папулярызацыя чытання | 2023– |
| **Лепельская ЦБС** | | | | |
| 18 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | **”Читаем классику сегодня“** *(праект)* | літаратурны | 2023– |
| 19 | | **”Маленькие чудеса в большой природе“** *(праект)* | экалагічны | 2023– |
| 20 | | **”Лето в режиме 3D: Двор. Дети. Досуг“** *(праграма)* | дасугавы | 2022–2023 |
| **Мёрская ЦБС** | | | | |
| 21 | Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка | **”Спадчына“** *(праграма)* | краязнаўчы | 2021–2025 |
| 22 | | **”Экалогія ад А да Я“** *(праграма)* | экалагічны | 2021–2025 |
| **Аршанская ЦБС** | | | | |
| 23 | Дзіцячая бібліятэка імя У.С. Караткевіча – філіял № 1 | **”Книжная Вселенная“** *(праграма)* | літаратурны | 2014–2025 |
| 24 | | **”Ступеньки в мир прекрасного“** *(праграма)* | музычна-эстэтычны | 2017–2025 |
| 25 | | **”Відэаэнцыклапедыі“** *(праект)* | краязнаўчы | 2023- |
| 26 | | **”Большие открытия маленьких коллекций“** *(праект)* | выставачная дзейнаць | 2023- |
| 27 | | **”Казачны каляндар“** *(праект)* | культурна-адукацыйны | 2023– |
| 28 | | **”Літаратурныя сцяжынкі роднага краю“** *(праект)* | краязнаўчы | 2023– |
| 29 | Дзіцячая бібліятэка імя Н.К. Крупскай – філіял № 8 | **”Территория безопасного детства“** *(праект)* | адукацыйны | 2023– |
| 30 | | **”Помним. Славим. Гордимся“** *(праект)* | гісторыка-патрыятычны | 2023– |
| **Полацкая РЦБС** | | | | |
| 31 | Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1 | **”Времена. События. Судьбы“** *(праграма)* | патрыятычны | 2022–2023 |
| 32 | | **”У книг не бывает каникул“** *(праграма)* | дасугавы | 2023 |
| 33 | | **”Аз і Букі беларускай культуры“** *(праграма)* | папулярызацыя нацыянальнай | 2022–2024 |



”Новая зямля“ (Пастаўская дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі), міжнародная акцыя ”Читаем белорусские книги“ (Шумілінская дзіцячая бібліятэка), міжнародная анлайн акцыя ”Перекличка городов и сел #НашеНаследие“ (дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога Полацкай РЦБС), міжнародны сеткавы анлайн-праект ”Лучшие сказочники мира. Шарль Перро: Виртуальное путешествие по сказкам“ (дзіцячая раённая бібліятэка Бешанковіцкай ЦБС).

Відавочны поспехі дзіцячых бібліятэк па стварэнню дзіцячых старонак на вэб-сайтах цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм. У 2023 годзе былі створаны яшчэ 3 дзіцячыя старонкі, у выніку чаго агульная колькасць старонак склала 12 адзінак. Яны размешчаны на вэб-сайтах Бешанковіцкай, Верхнядзвінскай, Гарадоцкай, Глыбоцкай, Лёзненскай, Мёрскай, Пастаўскай, Сенненскай, Ушацкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай ЦБС і ЦБС г. Наваполацка. Докшыцкая дзіцячая бібліятэка мае свой уласны інтэрнэт-сайт (https://det.doklibrary.by/index.php).

У 2023 годзе ў дзіцячых бібліятэках Віцебскай вобласці працавала **117** бібліятэчных спецыялістаў (у 2022 годзе – 120 спецыялістаў). Вышэйшую адукацыю маюць **70** супрацоўнікаў, у тым ліку вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці ”Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць“ – **40** спецыялістаў. Сярэднюю спецыяльную адукацыю маюць **46** супрацоўнікаў, з іх сярэднюю спецыяльную адукацыю па спецыяльнасці ”Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць“ маюць **38** спецыялістаў.

У справаздачным годзе палепшылася матэрыяльна-тэхнічная база Докшыцкай дзіцячай бібліятэкі, Пастаўскай дзіцячай бібліятэкі імя У. Дубоўкі, Чашніцкай раённай дзіцячай бібліятэкі імя Я. Журбы, Шумілінскай дзіцячай бібліятэкі. За бюджэтныя і пазабюджэтныя сродкі ўласнымі сіламі быў праведзены бягучы рамонт. У склад работ увайшоў рамонт фае, падлогі, афарбоўка сцен і падлогі, касметычны рамонт ганка.

Рэжым работы дзіцячых бібліятэк устаноўлены з улікам занятасці дзяцей у школе. У асноўным абслугоўванне карыстальнікаў забяспечваецца да 19.00 (20 бібліятэк), да 18.30 працуе Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1, да 18.00 працуюць 4 бібліятэкі. З іх максімальная колькасць адкрыта для карыстальнікаў у суботу і нядзелю.

2023 год быў адзначаны наступнымі юбілейнымі датамі. Так, **75 годдзе** адсвяткавалі Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1 ДУК ”Полацкая РЦБС“, Дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча ДУК ”Аршанская ЦБС“; **70 годдзе** адзначылі Дзіцячая раённая бібліятэка ДУК ”ЦБС Браслаўскага раёна“, Дзіцячая бібліятэка – філіял № 1 ДУК ”Лепельская ЦБС“, **45 годдзе** – Дзіцячая бібліятэка – філіял № 4 імя А. Пушкіна ДУК ”ЦБС г. Наваполацка“.

Па выніках справаздачнага гада былі адзначаны прафесійныя дасягненні супрацоўнікаў дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці.

Ганаровай граматай упраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта былі ўзнагароджаны Тамара Эдвардаўна Паляк, загадчык дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 1 Шаркаўшчынскай ЦБС, Святлана Вячаславаўна Зуева, загадчык бібліятэкай-філіялам № 9 імя С. Маршака

ЦБС г. Віцебска, Анастасія Анатольеўна Крупко, загадчык аддзелам абслугоўвання дзіцячай бібліятэкі імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка.

Ганаровай граматай Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў адзначана Таццяна Валер’еўна Варанец, загадчык дзіцячай бібліятэкі імя А. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка.

Ганаровую грамату аддзела культуры Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта атрымалі Арцём Пятровіч Бабарыка, бібліятэкар 1-й катэгорыі бібліятэкі-філіяла № 11 імя М. Лынькова ЦБС г. Віцебска і Галіна Аркадзьеўна Бардзюкова, бібліятэкар 1-й катэгорыі бібліятэкі-філіяла № 9 імя С. Маршака ЦБС г. Віцебска.

Занесены на Дошку гонару Галіна Цімафееўна Казінец, загадчык Новалукомльскай дзіцячай бібліятэкі і Ларыса Генадзеўна Шаламанава, бібліятэкар 2-й катэгорыі Чашніцкай раённай дзіцячай бібліятэкі імя Янкі Журбы Чашніцкай РЦБС.

Ганаровай граматай Наваполацкага гарадскога Савета дэпутатаў узнагароджана Таццяна Вячаславаўна Хватынец, загадчык дзіцячай бібліятэкі імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка.

Ганаровую Грамату сектара культуры Талачынскага райвыканкама атрымала Вольга Аляксандраўна Жанткоўская, загадчык гарадской дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 49 Талачынскай ЦБС.

Падзякай сектара культуры Бешанковіцкага раённага выканаўчага камітэта была адзначана Ірына Уладзіміраўна Гайко, бібліятэкар сектара па абслугоўванню дзіцячага чытача цэнтральнай раённай бібліятэкі Бешанковіцкай ЦБС.

Падзяку аддела культуры Полацкага раённага выканаўчага камітэта атрымала Зінаіда Альбінаўна Гуменнік, бібліятэкар 1 катэгорыі дзіцячай бібліятэкі імя Л. Талстога – філіял № 1 Полацкай РЦБС, Людміла Уладзіміраўна Сідарэнка, бібліятэкар 1-й катэгорыі дзіцячай бібліятэкі імя Л. Талстога – філіял № 1 Полацкай РЦБС, Валянціна Леанідаўна Еўдакімава, бібліятэкар дзіцячай бібліятэкі імя Я. Журбы – філіял № 6 Полацкай РЦБС.

Прэмія Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва ў намінацыі ”Лепшая дзіцячая бібліятэка“ па выніках работы за 2022 год была прысуджана раённай дзіцячай бібліятэцы імя У. Дубоўкі Пастаўскай ЦБС.

Дзіцячыя бібліятэкі пэўную частку сваёй працы з дзецьмі і падлеткамі будуюць, абапіраючыся на мэтавыя бібліятэчныя праграмы і праекты, што дазваляе ў найкарацейшыя тэрміны рэалізаваць усе магчымасці бібліятэчнага абслугоўвання. На працягу 2023 года бібліятэкары працавалі над **37** праграмамі і **39** праектамі для дзяцей і падлеткаў. Справаздачны год даў старт такім праектам і праграмам, як ”Кніга пачынаецца з пісьменніка“ (Докшыцкая дзіцячая бібліятэка), ”Маленькие чудеса в большой природе“ (Дзіцячая бібліятэка Лепельскай ЦБС), ”Літаратурныя сцяжынкі роднага краю“ (Дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча – філіял № 1 Аршанскай ЦБС), праект лялечнага тэатра ”Теремок“ (Дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы – філіял № 6 Полацкай





## Мэтавыя праграмы (праекты)

| № | Бібліятэка | Назва праграмы | Напрамак дзейнасці | Тэрміны дзеяння |
|---|---|---|---|---|
| | | **Бешанковіцкая ЦБС** | | |
| 1 | Філіял ”Дзіцячая раённая бібліятэка“ | **”Чарадзейная скарбока“** *(праграма)* | папулярызацыя беларускай культуры | 2013–2023 |
| 2 | | **”Книжная страна друзей“** *(праграма)* | папулярызацыя чытання | 2023- |
| 3 | | **”Сцяжынкамі родных традыцый“** *(праект)* | краязнаўчы | 2023- |
| 4 | | **”Дружат книга и кино“** *(праект)* | мастацка-літаратурны | 2023- |
| | | **Браслаўская ЦБС** | | |
| 5 | Дзіцячая бібліятэка | **”Мы хотим, чтобы ваше лото было книгами согрето“** (праграма) | папулярызацыя чытання | 2023-2024 |
| 6 | | **”Браславоведение“** (праграма) | гісторыка-краязнаўчы | 2023-2024 |
| | | **Верхнядзвінская ЦБС** | | |
| 7 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | **”В судьбе природы – наша судьба“** *(праграма)* | экалагічны | 2022–2023 |
| | | **Глыбоцкая ЦБС** | | |
| 8 | Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | **”Экологическая академия“** *(праграма)* | экалагічны | 2023–2025 |
| 9 | | **”Страна Читалия“** *(праграма)* | дасугавы | 2023–2025 |
| 10 | Падсвільская дзіцячая бібліятэка-філіял № 2 | **”Першы крок да кнігі“** *(праграма)* | папулярызацыя чытання | 2020–2023 |
| | | **Докшыцкая ЦБС** | | |
| 11 | Докшыцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | **”ЛУЧ“** (Лучшее учение – чтение) *(праграма)* | папулярызацыя чытання | 2009–2023 |
| 12 | | **”Книжная круговерть“** *(праграма)* | папулярызацыя чытання | 2023- |
| 13 | | **”Шаг вперёд“** *(праект)* | прававы | 2021–2023 |
| 14 | | **”Лета. Чытач.Кніга“** *(праграма)* | папулярызацыя чытання | 2023- |
| 15 | | **”Свежая прэса“** *(праект)* | папулярызацыя чытання | 2022–2023 |

*Дадатак 7*

## Лялечныя тэатры, тэатры кнігі

| № | Рэгіён | Назва | Ство-раны | Бібліятэка |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Сянно | Народны лялечны тэатр кнігі **”Пятрушка“** | 1996 | Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1 |
| 2 | Дуброўна | **”Золушка“** | 2020 | Філіял ”Рэдзькаўская сельская бібліятэка-клуб“ |
| 3 | Лепель | **”Ларец сказок“** | 1987 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 |
| 4 | Орша | **”Карусель“** | 2011 | Дзіцячая бібліятэка Імя У. Караткевіча |
| 5 | Полацк | **”Вясёлка“** | 2003 | Багатырская бібліятэка-філіял № 48 |
| 6 | Талачын | **”Куфэрак“** | 2006 | Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 |



РЦБС), ”Талачын – рамонак у вянку Беларусі“ (Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 Талачынскай ЦБС), ”Віцебшчына: гісторыя і сучаснасць“ (бібліятэка-філіял № 9 імя С. Маршака ЦБС г. Віцебска), ”Нескучное искусство“ (дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка).

25 мая 2023 года ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна падвялі вынікі абласнога конкурсу дзіцячых бібліятэчных гульнявых праграм ”Задума“. Са студзеня па красавік у гарадскіх і сельскіх бібліятэках вобласці ў рамках конкурсу адбыліся 38 гульнявых праграм, гледачамі якіх сталі больш за 600 дзяцей ва ўзросце ад 4 да 16 гадоў. Матэрыялы гульнявых праграм – сцэнарый, відэаролік і фотасправаздача – ацэньвала прафесійнае журы. Паводле вынікаў галасавання журы былі вызначаны лаўрэаты і ўладальнікі спецыяльных узнагарод. У намінацыі ”Сярод бібліятэк, размешчаных у горадзе (цэнтральныя раённыя/гарадскія, гарадскія, дзіцячыя)“ I Прэмію атрымала **Шаркаўшчынская дзіцячая бібліятэка** за фальклорную тэатралізаваную праграму *”Ляліны забавы“*. II Прэміяй была ўзнагароджана **Дзіцячая бібліятэка Верхнядзвінскай ЦБС** за літаратурнае свята *”Падарожжа ў Краіну Цудаў“* паводле кніг Люіса Кэрала. III Прэмію атрымала **Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 Талачынскай ЦБС** з турнірам знаўцаў беларускай мовы *”Ад зерня – колас, ад слова – мова“*. Уладальнікам спецыяльнага прыза ”За адлюстраванне ў рабоце мясцовага фальклорнага матэрыялу“ стаў **аддзел па рабоце з дзецьмі цэнтральнай раённай бібліятэкі Лёзненскай ЦБС** за гульнявую праграму па работах М.Я. Нікіфароўскага *”Як на нашым на балоце“*.

У лістападзе 2023 года калектыў народнага лялечнага тэатра кнігі ”Пятрушка“ **Сенненскай дзіцячай раённай бібліятэкі** прыняў удзел у абласным конкурсе лялечных тэатраў і батлеечных калектываў *”Лялечны свет – 2023“* і заняў II месца ў намінацыі *”Лялечны спектакль“*. Увазе гледачоў быў прадстаўлены лялечны спектакль *”Вясёлы кагарод“* паводле сцэнарыя Ірыны Парахневіч.

У 2023 годзе пры публічных бібліятэках Віцебскай вобласці ажыццяўлялі працу **194** клубныя фарміраванні для дзяцей да 18 год, у якіх было занята звыш за **2,3** тысячы непаўналетніх. Пры дзіцячых бібліятэках працавалі **33** клубы з агульнай колькасцю ўдзельнікаў – **570** чалавек. Усе мерапрыемствы звычайна праводзіліся ў пазаўрочныя, канікулярныя часы і выхадныя дні для максімальнай занятасці дзяцей – членаў клубаў па інтарэсах. Трэба адзначыць, што ў справаздачным годзе распачалі працу **3** клубы па інтарэсах: ”Юны эколаг“ (Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1), ”Вянок беларускіх слоў“ (дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Лепельскай ЦБС), ”Умелыя ручкі“ (Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 Талачынскай ЦБС) і ”Аленький цветочек“ (бібліятэка-філіял № 11 імя М. Лынькова ЦБС г. Віцебска).

Пры арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў для дзяцей і падлеткаў публічныя бібліятэкі Віцебскай вобласці цесна супрацоўнічалі з рознымі арганізацыямі і ўстановамі: школамі, дзіцячымі садамі, цэнтрамі

дзіцячай творчасці, школамі мастацтваў, дзіцячымі аздараўленчымі лагерамі, дзіцячымі сацыяльнымі прытулкамі, клубнымі і медыцынскімі ўстановамі, аддзеламі па надзвычайных сітуацыях і праваахоўнымі органамі, царквой, грамадскімі арганізацыямі і г.д.

У 2023 годзе былі аформлены **1 529** *бібліятэчных экспазіцый* і **134** *мастацкія выставы*. Для развіцця творчасці дзяцей і падлеткаў дзіцячымі бібліятэкамі праведзены **181** *майстар-клас* і арганізавана **184** *акцыі*. Такая работа дазваляе змястоўна арганізаваць вольны час дзяцей, спрыяе фарміраванню культуры міжасабовых зносін, выяўленню і ў пэўнай ступені рэалізацыі творчых здольнасцей і задаткаў дзяцей. У цэлым дзейнасць дзіцячых бібліятэк была накіравана на задавальненне чытацкіх патрэб, папулярызацыю нацыянальнай і культурнай спадчыны, мовы і літаратуры, на падтрымку і развіццё чытання сярод дзяцей і падлеткаў.

## Дзейнасць дзіцячых бібліятэк да Года міру і стварэння. Краязнаўчае выхаванне

У мэтах кансалідацыі беларускага народа, умацавання ў грамадстве ідэй міру і стваральнай працы як галоўных умоў развіцця беларускай дзяржавы Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 2023 год быў аб’яўлены Годам міру і стварэння. Дзіцячыя бібліятэкі Віцебскай вобласці ў рамках Года міру і стварэння арганізавалі і правялі шэраг культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў і адукацыйных праектаў.

Прадэманстраваць паўнату кніжных фондаў бібліятэк у гэтым напрамку дапамагалі кніжныя экспазіцыі, якія садзейнічалі больш глыбокаму пранікненню ў тэму, разуменню і ўспрыманню прадстаўленых на ёй дакументаў: *”Для нас патрэбен мір“* **(Пастаўская дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі)**, *”2023 – Год міру і стварэння“* **(Гарадская дзіцячая бібліятэка Талачынскай ЦБС)**, *”Мы – разам!“* **(дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Лепельскай ЦБС)**, *”Посмотри, как хорош – мир, в котором ты живёшь“* **(дзіцячая раённая бібліятэка Бешанковіцкай ЦБС)**, *”Дорогой мира, знаний и добра“* **(Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка)**, *”Через книгу – к миру и созиданию“* **(Докшыцкая дзіцячая бібліятэка)**.

Відавочныя поспехі **Докшыцкай дзіцячай бібліятэкі** падчас святкавання Дня народнага адзінства, свята згуртаванасці, непадзельнасці і яднання. Інтэрактыўная віктарына *”Што ты ведаеш пра Беларусь?“* ставіла мэтай пазнаёміць першакласнікаў з нацыянальнымі сімваламі нашай краіны, беларускім народным адзеннем, прыгажосцю прыроды роднага краю. А прыемным завяршэннем мерапрыемства стаў лялечны спектакль *”Заяц і вавёрка“*. Для чытачоў сярэдняга школьнага ўзросту былі падрыхтаваны інфармацыйная гадзіна *”Мы, беларусы, мы – народ такі“* і вусны часопіс *”Краіна славы партызанскай, краіна міру і даброт“*. Дзеці



| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | імя М. Лынькова | | | | |
| 28 | Гурток **”Аленький цветочек“** | Бібліятэка-філіял № 11 імя М. Лынькова | 2023 | 15 | эстэтычны | дзеці |
| 29 | Клуб **”Сустрэча“** | Бібліятэка-філіял № 9 імя С. Маршака | 2008 | 9 | дасугавы | пажылыя |
| **ЦБС г. Навапалацка** | | | | | | |
| 30 | Клуб **”Пралеска“** | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А.С. Пушкіна | 1996 | 26 | экалагічны | мал. шк. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 13 | Клуб **”Уют-компания“** | Дзіцячая бібліятэка імя Н. Крупскай – філіял № 8 | 2010 | 23 | дасугавы | дзеці і дарослыя |
| **Полацкая РЦБС** | | | | | | |
| 14 | Экалагічны клуб **”Экоша“** | Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1 | 1998 | 27 | экалагічны | дзеці |
| 15 | Урокі бяспекі **”Безопасное детство“** | Дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы – філіял № 6 | 2018 | 15 | здаровы лад жыцця | дзеці |
| **Пастаўская ЦБС** | | | | | | |
| 16 | Клуб **”Нашчадкі“** | Раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі – філіял № 1 | 2007 | 26 | краязнаўчы | дзеці |
| **Сенненская ЦБС** | | | | | | |
| 17 | Клуб **”Чамучка“** | Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1 | 2017 | 9 | літаратурна-мастацкі | мал. шк. |
| **Талачынская ЦБС** | | | | | | |
| 18 | Гурток **”Мельпамена“** | Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 | 2006 | 10 | літаратурна-мастацкі | дзеці |
| 19 | Гурток **”Умелыя ручкі“** | | 2023 | 6 | вытворча-тэхнічны | дзеці |
| **Чашніцкая РЦБС** | | | | | | |
| 20 | Клуб **”Чамучка“** | філіял ”Чашніцкая раённая дзіцячая бібліятэка імя Янкі Журбы“ | 1993 | 25 | шматпрофільны | дзеці |
| 21 | Аматарскае аб’яднанне **”Крыніца“** | | 1998 | 19 | шматпрофільны | дзеці |
| 22 | Клуб па інтарэсах **”Эўрыка“** | філіял ”Новалукомльская гарадская бібліятэка“ | 2013 | 26 | шматпрофільны | дзеці |
| 23 | Клуб духоўнай асветы **”Благодать“** | | 2020 | 36 | духоўны | дзеці |
| **Шаркаўшчынская ЦБС** | | | | | | |
| 24 | Клуб **”Жывое слова“** | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 2017 | 7 | літаратурна-мастацкі | сяр. шк. |
| **Шумілінская ЦБС** | | | | | | |
| 25 | Клуб па інтарэсах **”Homolegens“** | Дзіцячая бібліятэка | 2007 | 12 | літаратурны | дзеці |
| **ЦБС г. Віцебска** | | | | | | |
| 26 | Гурток **”Бусляня“** | Бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча | 2007 | 10 | краязнаўчы | дзеці |
| 27 | Клуб **”Вікторыя“** | Бібліятэка-філіял № 11 | 2006 | 10 (4 дзеці) | дасугавы | бацькі, дзеці |



аднавілі свае веды па гісторыі і нацыянальных сімвалах Беларусі, прынялі ўдзел у краязнаўчых віктарынах і паразважалі над тым, што такое адзінства.

**Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка** прапанавала навучэнцам ДУА ”Мёрская сярэдняя школа № 3 імя Героя Савецкага Саюза Я.А. Томкі“ пазнавальную квэст-гульню *”Маленькім беларусам пра вялікую Беларусь“*. Супрацоўнікі прапанавалі дзецям пагрузіцца ў свет беларускай гісторыі і культуры. Потым, падзяліўшыся на каманды, удзельнікі квэсту прайшлі іспыты, адказалі на пытанні, выканалі ўсе заданні і паўдзельнічалі ў рухомых гульнях *”Музычная скарбонка“* і *”Беларуская гульня“*. За кожнае правільна пройдзенае выпрабаванне дзеці атрымлівалі літары, з якіх пазней склалі словы *”Спадчына“* і *”Беларусь“*.

Трэба адзначыць дзейнасць **Глыбоцкай дзіцячай бібліятэкі**. Яна прыняла ўдзел у раённым выставе-конкурсе дзіцячай і маладзёжнай творчасці *”Наша история – наша гордость“*. Бібліятэку на конкурсе прадставіла вучаніца 9-га класа раённай гімназіі Ліза Юргель з эсэ *”Ігнат Буйніцкі – самародак беларускай зямлі“*. У сваёй працы яна раскрыла асобу тэатральнага дзеяча-земляка, а таксама гісторыю станаўлення беларускага тэатра. У Дзень Незалежнасці на цэнтральнай плошчы горада адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне ўдзельнікаў конкурсу. Ліза Юргель атрымала Дыплом I ступені.

2023 год – юбілейны для Віцебскай вобласці. Ёй споўнілася 85 год з дня заснавання. З гэтай нагоды **Докшыцкая дзіцячая бібліятэка** запрасіла сваіх чытачоў на краязнаўчую экскурсію *”Віцебшчына любая мая“*. Вядома, каб ганарыцца сваім рэгіёнам, яго трэба ведаць. Таму госці бібліятэкі, вучні 4-га класа СШ № 2 г. Докшыцы, стварылі экспертныя групы: вандроўнікі, эколагі, гісторыкі, краязнаўцы. Падчас мерапрыемства дзеці даследавалі крыніцы інфармацыі і рыхтавалі паведамленні для сваіх аднакласнікаў. Вандроўнікі распавялі пра знакамітыя мясціны Віцебшчыны, гісторыкі ўдакладнілі цікавыя гістарычныя факты, эколагі пазнаёмілі з Бярэзінскім запаведнікам, а краязнаўцы засяродзілі ўвагу на родным горадзе. У завяршэнні мерапрыемства бібліятэкары расказалі пра вядомых пісьменнікаў, якія нарадзіліся на Віцебшчыне. Бібліятэка-філіял № 9 імя С. Маршака ЦБС г. Віцебска на працягу года рэалізоўвала краязнаўчы праект *”Віцебшчына: гісторыя і сучаснасць“*. У межах праекта прайшло 14 мерапрыемстваў, якія наведала 234 удзельнікі. Чытачоў знаёмілі з цікавымі адметнасцямі нашай малой радзімы: Віцебскім абласным краязнаўчым музеем, мастацкай школай Юдэля Пэна, музеем-сядзібай Ільі Рэпіна ў Здраўнёва і інш.

Аналіз гадавых справаздач дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці паказвае, што краязнаўчая дзейнасць застаецца адным з прыярытэтных напрамкаў. Дзіцячыя бібліятэкі ажыццяўлялі паўнацэнную інфармацыйную падтрымку даследчых работ дзяцей і падлеткаў, фарміравалі ў чытачоў сістэму ведаў аб краязнаўстве, развівалі ўстойлівую цікавасць да краязнаўчай літаратуры, прыцягвалі юных чытачоў да вывучэння роднага краю. Акрамя таго, у 2023 годзе пры публічных бібліятэках працавалі 19 аматарскіх аб’яднанняў юных краязнаўцаў, у тым

ліку 3 клубы ажыццяўлялі сваю дзейнасць на базе дзіцячых бібліятэк (аматарскае аб’яднанне *”Краязнаўчая майстэрня“* **дзіцячай бібліятэкі імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС**, клуб *”Нашчадкі“* **раённай дзіцячай бібліятэкі імя У. Дубоўкі Пастаўскай ЦБС**, гурток *”Бусляня“* **бібліятэкі-філіяла № 14 імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска**). Разам з тым, дзіцячыя бібліятэкі пэўную частку сваёй працы з дзецьмі і падлеткамі будавалі, абапіраючыся на мэтавыя бібліятэчныя праграмы і праекты краязнаўчай тэматыкі. Відавочны поспех у гэтым накірунку належыць **гарадской дзіцячай бібліятэкі Талачынскай ЦБС**. Да 590-годдзя г. Талачын яна распрацавала краязнаўчы праект *”Талачын – рамонак у вянку Беларусі“*. У рамках праекта дзейнічала тэматычная выстава *”Сэрцу мілы куток – наш Талачынскі гарадок“*, якая змяшчала шэраг краязнаўчых матэрыялаў, кнігі, альбомы. Для вучняў 5-га класа СШ № 2 была праведзена гадзіна-экскурс *”Талачын: ад мінулага да сучаснасці“*. Падчас гадзіны паэзіі *”Табе, мой горад прысвячаю...“* школьнікі пазнаёміліся з вершамі мясцовых паэтаў: Віктара Бірукова, Алеся Мазура, Міхаіла Татарановіча, Уладзіміра Чаплянка. Да свята ў гонар юбілею горада супрацоўнікі бібліятэкі арганізавалі тэматычную пляцоўку *”Талачыншчына партызанская“*, у якую ўвайшлі кніжная экспазіцыя *”Юныя героі Талачыншчыны“*, віктарына *”Кола гісторыі“*, конкурс дзіцячага малюнка *”Горад мой, ты самы лепшы“*, майстар-клас па вырабу паштоўкі *”Віншуем Вас!“*. **Дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС** у справаздачным годзе пачала новы праект *”Літаратурныя сцяжынкі роднага краю“*, мэтай якога стала папулярызацыя чытання сярод дзяцей і моладзі, фарміраванне пачуцця любові да малой радзімы, да яе гістарычнай памяці, а таксама знаёмства з жыццём і творчасцю аршанскіх пісьменнікаў. У рамках праекта быў арганізаваны паэтычны куток творчасці вучняў узорнай школы паэзіі ”Лотас“, заснаванай Марыяй Міхайлаўнай Дзмітранок. На ім былі прадстаўлены персанальныя і калектыўныя зборнікі юных паэтаў і іх настаўнікаў.

Асобную ўвагу заслугоўвае экскурсійная дзейнасць **Пастаўскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы**, а менавіта праца *Людмілы Францаўны Сяменас*, бібліятэкара **раённай дзіцячай бібліятэкі імя У. Дубоўкі – філіял № 1**. Яна прайшла атэстацыю ў Нацыянальным агенцтве па турызме Рэспублікі Беларусь і мае афіцыйны дазвол праводзіць экскурсіі па маршруце ”Край азёр, касцёлаў, паркаў“. Праваднік у мінулае дапамагае вандроўнікам узбагаціць і пашырыць свае веды, прывязці з сабой новыя ўражанні, станоўчыя эмоцыі і ўспаміны. З яе ўдзелам у бібліятэцы ладзяцца нямала дзіцячых мерапрыемстваў, звязаных з вывучэннем гісторыі родных мясцін, азнаямленнем з разнастайнымі славутасцямі, культурна-гістарычнай спадчынай Пастаўшчыны, яе самабытнай архітэктурай, славутымі продкамі (віртуальнае падарожжа *”Топ-5 асаблівых будынкаў маёй краіны“*, літаратурна-гістарычны нарыс *”Антоній Тызенгаўз у гісторыі Пастаў“*, этна-прастора *”Бабуліна спадчына“* і інш.).





## Клубы, гурткі і аматарскія аб’яднанні

| № | Назва клуба | Бібліятэка | Год ства-рэння | Колькасць удзельнікаў | Напрамак дзейнасці | Мэтавая аўдыто-рыя |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Бешанковіцкая ЦБС** | | | | | | |
| 1 | Клуб **”Крынічка“** | Філіял ”Дзіцячая раённая бібліятэка“ | 1990 | 17 | літаратурны | дзеці сяр. і ст. шк. узросту |
| **Браслаўская ЦБС** | | | | | | |
| 2 | Клуб **”ЭтнаУсё пра Беларусь“** | Дзіцячая бібліятэка | 2022 | 31 | літаратурна-краязнаўчы | дзеці |
| **Верхнядзвінская ЦБС** | | | | | | |
| 3 | Гурток **”Экоша“** | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 2009 | 19 | экалагічны | дзеці мал. шк. узросту |
| **Глыбоцкая ЦБС** | | | | | | |
| 4 | Клуб **”Кнігавічок“** | Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 2014 | 27 | дасугавы | дзеці мал. і сярэд. шк. узросту |
| 5 | Клуб **”Юны эколаг“** | | 2023 | 25 | экалагічвы | дзеці мал. і сярэд. шк. узросту |
| 6 | Клуб **”Чароўная школа“** | Падсвільская дзіцячая бібліятэка-філіял № 2 | 1997 | 20 | літаратурна-мастацкі | дзеці мал. і сярэд. шк. узросту |
| **Докшыцкая ЦБС** | | | | | | |
| 7 | Клуб **”Лукамор’е“** | Докшыцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 2007 | 8 | літаратурны | дзеці |
| 8 | Клуб **”Бібліягоша“** | | 2012 | 15 | эстэтычны | |
| **Лепельская ЦБС** | | | | | | |
| 9 | Клуб **”Вянок беларускіх слоў“** | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 2023 | 27 | літаратурны | дзеці |
| **Мёрская ЦБС** | | | | | | |
| 10 | Клуб **”Знайка“** | Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка | 1997 | 12 | дасугавы | мал. шк. |
| **Аршанская ЦБС** | | | | | | |
| 11 | Аматарскае аб’яднанне **”Краязнаўчая майстэрня“** | Дзіцячая бібліятэка імя У.С. Караткевіча – філіял № 1 | 2008 | 17 | краязнаўчы | вучні школ горада |
| 12 | Клуб аматараў бісерапляцення **”З любоўю і фантазіяй“** | | 2011 | 12 | эстэтычны | дзеці і дарослыя |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Шаркаўшчынская ЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | https://scharcbs.by/detskaya-stranichka/videogalereya.html | Старонка ”Шарковщинская детская библиотека“ https://vk.com/id791175381 | Старонка ”Шарковщинская детская библиотека“ https://ok.ru/profile/584721740364 | Старонка ”Шарковщинская детская библиотека“ https://www.instagram.com/sharkovshchinskaiadetskaia/ |
| **Шумілінская ЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка | http://www.shumilino1.lepshy.by/detskaya-biblioteka | Старонка ”Шумилинская детская библиотека“: https://vk.com/public114768109 | | Старонка ў Instagram: https://www.instagram.com/detskaia_biblioteka_shumilino/ |
| **ЦБС г. Віцебска** | | | | |
| Бібліятэка-філіял № 9 імя С. Маршака | | Старонка ”Самуил Маршак“: https://vk.com/id454998101 | Старонка ”Библиотека Самуил Маршак“: https://ok.ru/profile/561334781176 | |
| Бібліятэка-філіял № 11 імя М. Лынькова | | Старонка ”Библиотека им.М. Лынькова г. Витебск“: https://vk.com/public195501493 | | |
| Бібліятэка-філіял № 12 імя Н. Астроўскага | | Старонка ”Детская-Библиотека Н-Островского“: https://vk.com/id480381092 | | |
| Бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча | | Старонка ”Бібліятэка імя Ул. Караткевіча“: https://vk.com/club166435700 | | |
| **ЦБС г. Наваполацка** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака | http://novopolotsk-lib.by/index.php/detyam | Група ”Детская библиотека имени С. Маршака г. Новополоцк“ https://vk.com/marshaka_np | | Старонка ў Instagram: detskajabiblioteka_np https://www.instagram.com/detskajabiblioteka_np |
| Дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А.С. Пушкіна | | | | Старонка ў Instagram: ”detskaiabiblioteka_a.s.p“ (Детская Библиотека им. Пушкина): https://www.instagram.com/detskaiabiblioteka_a.s.p/ |



## Папулярызацыя беларускай культуры, мовы і літаратуры. Супрацоўніцтва з ГА ”Саюз пісьменнікаў Беларусі“

З мэтай арыентавання дзяцей у культуры, традыцыях і звычаях беларускага народа **дзіцячая бібліятэка Шаркаўшчынскай ЦБС** арганізавала фальклорна-тэатралізаваную гульнявую праграму *”Ляліны забавы“*. Ляля – міфічная істота з крыламі, якая ахоўвае дзіцячы сон. У яе ролі выступіла бібліятэкар Людміла Казіцкая, якая і распрацавала сцэнарый праграмы. Ляля, разам са сваімі маленькімі памочніцамі, прапанавалі дзецям прыняць удзел у самых розных забавах. Хлопчыкам і дзяўчынкам прапанавалі згуляць у *”Кот і малачко“*, *”Сонцазварот“*, *”Калыханка“*, *”Ручаёк“*. Ляля па чарзе загадвала дзецям загадкі. Тыя, хто даваў трапныя адказы, атрымлівалі салодкі пачастунак. З ахвотай удзельнікі мерапрыемства вадзілі карагоды і завязвалі рознакаляровыя стужкі на сімвалізаваным ”Дрэве жаданняў“.

Кожны год 21 лютага ў Міжнародны дзень роднай мовы бібліятэкары ладзяць шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да гэтай даты, сярод якіх можна асобна вылучыць кніжныя выставы *”Краса і сіла роднай мовы“* (**Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка**), *”Суквецце беларускіх дзіцячых кніг“* (**Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка**), *”Не саромся, беларус, гаварыць па-свойму“* (**Докшыцкая дзіцячая бібліятэка**), *”Пад небам беларускага слова“* (**дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС**) і акцыі *”Родная мова, цудоўная мова!“* (**Шумілінская дзіцячая бібліятэка**), *”Знаўцы роднай мовы“* (**дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС**), *”Маё любімае слова па-беларуску“* (**бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Віцебска**). Шмат станоўчых водгукай атрымала акцыя *”Размаўляем па-беларуску. Далучайся і ты“* **Гарадской дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 49 Талачынскай ЦБС**. У гэты дзень наведвальнікаў бібліятэкі ў прыгожа ўбранай зале сустракала бібліятэкар у нацыянальным беларускім адзенні. Фонам на працягу ўсяго святочнага дня гучала беларуская музыка. Падчас акцыі для дзяцей праводзіліся літаратурнае лато *”Смак мовы“*, конкурс *”Пазнай твор па яго пачатку“*, гучныя чытанні вершаў на беларускай мове.

Што датычацца мерапрыемстваў, прымеркаваных да Міжнароднага дня роднай мовы, то яны ўжо сталі традыцыйнымі для кожнай бібліятэкі. *”Гавары са мной па-беларуску“* – пад такой назвай быў арганізаваны дзень роднай мовы для навучэнцаў сярэдніх класаў ДУА ”Сярэдняя школа № 1 г. Чашнікі імя Я.Ф. Іваноўскага“ і малодшых класаў ДУА ”Сярэдняя школа № 4 г. Чашнікі“ ў **Чашніцкай раённай дзіцячай бібліятэцы імя Янкі Журбы**. У гэты дзень для іх былі праведзены гульня-падарожжа *”Ці ведаеш ты сваю мову?“*, літаратурная гадзіна *”Табою сагрэты, роднае слова!“*. Падчас гульні-інсцэніроўкі *”Адгадай фразеалагізм па малюнку і растлумач яго“* гучалі цікавыя выказванні беларускіх пісьменнікаў аб роднай мове. Дзеці чыталі вершы, адгадвалі тэматычныя рэбусы *”Загадкі з кошыка“* і адказвалі на пытанні

літаратурных віктарын *”Рассыпаныя прыказкі і прымаўкі“*, *”Словазнаўцы“*, *”Адгадай твор па радках“*.

**Аддзел дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэкі** рэалізоўваў праект *”Чытаем разам па-беларуску“*. У рамках работы праекта для маленькіх выхаванцаў дзіцячых садоў горада было праведзена віртуальнае падарожжа *”Чароўнае кола беларускіх казак“*. Падчас сустрэчы дзеці пазнаёміліся з беларускімі пісьменнікамі, паслухалі казкі, паразгадвалі загадкі, паўдзельнічалі ў вясёлых гульнях і конкурсах. Завяршылася мерапрыемства паказам лялечных спектакляў *”Як кот звяроў напалохаў“* і *”Бесклапотны зайка“*.

**Докшыцкая дзіцячая бібліятэка** да Дня беларускага пісьменства распрацавала гістарычны квіз *”Пісьменнасць у Беларусі: крок у гісторыю“*, які ставіў сваёй мэтай пазнаёміць чытачоў малодшага школьнага ўзросту з беларускім першадрукаром Францыскам Скарынам, з імёнамі тых, хто ўнёс вялікі ўклад у развіццё беларускай мовы і літаратуры. Супрацоўнікі расказалі пра духоўна-асветніцкую экспедыцыю *”Дарога да святыняў“*, падрыхтавалі для дзяцей мультымедыйную прэзентацыю пра помнікі і памятныя знакі свята, кніжную выставу *”Беларусь пісьменная“*.

Штогод у **Чашніцкай раённай дзіцячай бібліятэцы імя Янкі Журбы** ўслаўляюць пісьменніка і паэта, імя якога носіць установа. Да 142-годдзя з дня нараджэння пісьменніка-земляка для навучэнцаў сярэдніх класаў ДУА ”Сярэдняя школа № 1 г. Чашнікі імя Я.Ф. Іваноўскага“ супрацоўнікі бібліятэкі правялі літаратурны вечар-партрэт *”У родных мясцінах…“*. Прысутныя пазнаёміліся з жыццём і творчасцю пісьменніка, слухалі і самі чыталі творы ”У зімовы вечар“, ”На радзіме“, ”Зоркі“, ”Маё жаданне“, ”У ясны дзень“. Мерапрыемства дапоўніла выстава *”Пясняр роднага краю“*, на якой былі прадстаўлены зборнікі твораў Янкі Журбы.

**Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка** вучням пачатковых класаў прапанавала вусны часопіс *”У свеце дзіцячых пісьменнікаў Беларусі“*. Першая старонка часопіса была прысвечана творчасці Уладзіміра Ягоўдзіка. Дзеці пазнаёміліся з яго кнігамі ”Лясныя таямніцы“, ”Год – карагод“ і ”Шлях Рагвалода“. Удзельнікі мерапрыемства сустрэліся з рознымі звярамі, птушкамі, раслінамі беларускіх лясоў, з цікавасцю ўдзельнічалі ў віктарыне *”Пазнай птушку“* і ў гульні *”Птушкалоў“*. На другой старонцы дзеці пазнаёміліся з творчасцю Алены Масла, прачыталі і абмеркавалі казку ”Цудадзейныя лекі“. Кацярына Хадасевіч-Лісавая, творчасці якой была прысвечана трэцяя старонка часопіса, выкарыстоўвае незвычайную падачу дзіцячай гісторыі (кніга-перакрутка ”Вухуцік. Васільвася“). Кожная дзіцячая кніга Ірыны Токаравай – яе творчасці адпавядала чацвёртая старонка вуснага часопіса – інтэрактыўнае падарожжа ў свет гульні і логікі, знаёмства з жыццём людзей у Старажытным Егіпце і Грэцыі, паглыбленне ў таямніцы Мірскага замка. Напрыканцы мерапрыемства дзеці з задавальненнем дзяліліся ўражаннямі.

Работа па папулярызацыі кнігі і чытання ў **Дзіцячай бібліятэцы Браслаўскай ЦБС** была арганізавана ў адпаведнасці з комплекснай



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | https://vk.com/childlibrary1 | | a_korotkevicha?utm_med |
| Дзіцячая бібліятэка імя Н.К. Крупскай – філіял № 8 | | Старонка ”Детская-Библиотека Им-Нк-Крупской“ https://vk.com/id699535915 | | |
| **Полацкая РЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1 | | Група ”Детская библиотека им. Л.Н. Толстого (филиал №1)“: https://vk.com/club44671036 Старонка ”Библио Филиал“ Центр чтения и активного творчества в Полоцке: https://vk.com/bibliopuzzle | | Старонка ў Instagram: https://www.instagram.com/detbibl.tolstoy.polock |
| Дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы – філіял № 6 | | Група: https://vk.com/public219499112 | | Старонка ў Instagram: https://www.instagram.com/detskjabiblioteka_filial_6 |
| **Пастаўская ЦБС** | | | | |
| Раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі – філіял № 1 | http://libpost.of.by/chitatelyu/detskaya-stranichka/ | ”Поставская Детская-Библиотека“: https://vk.com/id764027439 | | Старонка ў Instagram: www.instagram/child_lib_postavy/ Канал ”Поставская детская библиотека им. В. Дубовки“: https://www.youtube.com/@user-uo3qc2sx4z |
| **Сенненская ЦБС** | | | | |
| Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1 | http://cbs-senno.by/index.php/pages/all-for-kids | | | |
| **Чашніцкая ЦБС** | | | | |
| філіял ”Чашніцкая раённая дзіцячая бібліятэка імя Янкі Журбы“ | | | | Старонка ў Instagram: https://www.instagram.com/detbibchashniki/ |

**Прадстаўніцтвы дзіцячых бібліятэк у сацыяльных сетках**

| Назва бібліятэкі | Дзіцячая старонка на сайце ЦБС | ВКонтакте | Одноклассники | Instagram Facebook |
|---|---|---|---|---|
| **Верхнядзвінская ЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | https://xn—90aabzbrw.xn—90ais/stranichka-odnoj-biblioteki | | Група ”Верхнедвинская детская библиотека“: https://ok.ru/vdvinskchild | Група ”child_library.vdvinsk“: https://www.instagram.com/child_library.vdvinsk/ |
| **Глыбоцкая ЦБС** | | | | |
| Падсвільская дзіцячая бібліятэка-філіял № 2 | | Група ”Подсвильская-Детская-Библиотека библиотека“: https://vk.com/id619518729 | | |
| **Докшыцкая ЦБС** | | | | |
| Докшыцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | Сайт: http://det.doklibrary.by/index.php/ru/ | Група ”Докшицкая-Детская Библиотека“: https://vk.com/id552762520 | | |
| **Лепельская ЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | | Старонка ”детская библиотека г. Лепель“: https://vk.com/public55828453 | Група ”Детская библиотека ГУК «Лепельская ЦБС»“: https://ok.ru/group/60726043607226 | Старонка ў Instagram ”biblioteka_detskaya_lepel“: https://www.instagram.com/biblioteka_detskaya_lepel/ |
| **Мёрская ЦБС** | | | | |
| Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка | https://miory-biblioteka.by/detskay | Група ”Миорская-Детская Библиотека“: https://vk.com/id435146937 | | |
| **Аршанская ЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча – філіял № 1 | | Група ”Детская библиотека им. В.С. Короткевича“: https://vk.com/club187365088 Старонка ”Детская-Библиотека Им-Вс-Короткевича“ | | Профіль ў Instagram ”Детская библиотека им. В.С.Короткевича“: https://instagram.com/bibliotek |



мэтавай праграмай *”Читайте сами, читайте с нами!“*. Бібліятэка падрыхтавала шмат цікавых, разнастайных па форме мерапрыемстваў, якія садзейнічалі папулярызацыі лепшых узораў нацыянальнай літаратуры. Кнігам-юбілярам прысвячаліся выставы ў форме літаратурнай візітоўкі, інфармацыйны агляд *”Срэбраная табакерка“* З. Бядулі, кніжкін юбілей *”Вавёрчынай гары“* В. Віткі, ваенныя старонкі кніг *”Мы з Санькам у тыле ворага“* І. Сяркова, *”Радной зямлі душа и памяць“*, літаратурны экскурс *”Беларусь у прасторы і часе“*, *”Добры дзень, кніжка беларуская!“*.

**Докшыцкая дзіцячая бібліятэка** стала ўдзельнікам рэспубліканскага сеткавага праекта *”Беларусь літаратурная“*. Мэтай праекта стала стварэнне google-карты з пазначанымі на ёй актыўнымі інфармацыйнымі меткамі пра беларускіх пісьменнікаў, каб данесці да грамадскасці прозвішчы пісьменнікаў-землякоў. У выніку рэалізацыі праекта на карце рэспублікі з’явілася 184 імёны айчынных аўтараў. Сярод якіх пісьменнікі – ураджэнцы Докшыцкага раёна: Юрась Свірка, Алесь Ставер, Іван Стадольнік, Фёдар Палачанін, Кастусь Акула, Эдуард Зубрыцкі, Леаніла Чарняўская, Лявон Гмырак. Таксама, у **Докшыцкай дзіцячай бібліятэцы**, на працягу года рэалізоўваўся праект *”Кніга пачынаецца з пісьменніка“*. Так, у бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь у намінацыі ”Лепшы дэбют“ Сяргеем Клімковічам. Пісьменнік паўстаў у абліччы казачніка і з першых хвілін зацікавіў дзяцей. З цікавымі фактамі біяграфіі Сяргея Клімковіча дапамагла пазнаёміцца гульня *”Праўда або не“*. Хлопчыкі і дзяўчынкі наперабой задавалі пытанні вядомаму госцю. Напрыканцы сустрэчы пісьменнік прапанаваў чытачам акунуцца ў свет магіі і чараўніцтва. Дзеці былі ў захапленні, з задавальненнем вучыліся паказваць фокусы, атрымоўваючы ад галоўнага героя мерапрыемства магічныя крышталікі.

16 лютага **дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС** сустракала дзіцячых пісьменнікаў Кацярыну Хадасевіч-Лісавую і Ірыну Карнавухаву, якія прыехалі з прэзентацыяй сваіх новых кніг. Ініцыятарам сустрэчы выступіў выдавецкі дом ”Звязда“. Вельмі лёгка і нязмушана госці вялі дыялог з вучнямі ДУА ”Гімназія № 2 г. Оршы“. Кацярына Станіславаўна і Ірына Аляксандраўна прадставілі ўжо вядомыя дзецям творы і расказалі пра новыя кнігі. Хлопчыкі і дзяўчынкі ўважліва слухалі, а самыя дапытлівыя цікавіліся творчымі планамі аўтараў, адкуль яны чэрпаюць натхненне і як нараджаюцца такія незвычайныя героі. Дарослыя з задавальненнем дзяліліся сакрэтамі свайго майстэрства. Пасля заканчэння мерапрыемства ўсе жадаючыя маглі набыць кнігу з аўтографам аўтара.

Адкрыццё Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі традыцыйна лічыцца галоўным мерапрыемствам года. Кожны дзень тыдня – гэта яркая кампанія па папулярызацыі кніг розных жанраў і тэматыкі. Для маленькіх сяброў бібліятэкары праводзілі святы кнігі, гульні, віктарыны, літаратурныя сустрэчы, урокі-экскурсіі, тэатралізаваныя прадстаўленні і ранішнікі. У **Гарадской дзіцячай бібліятэцы-філіяле № 49 Талачынскай ЦБС**

Тыдзень распачаўся мерапрыемствам *”Чытайце, чытайце, старонкі гартайце“*, падчас якога дзеці даведаліся аб гісторыі ўзнікнення ”Кніжкіных імянін“, прымалі актыўны ўдзел у літаратурных і музычных конкурсах і віктарынах, гулялі і спявалі, сустракалі казачных герояўКата Базіліо і Лісу Алісу. На працягу тыдня былі праведзены літаратурная гадзіна *”Добрыя казкі Уладзіміра Суцеева“*, віктарына-пошук *”Мы з казак, адгадайце без падказкі“*, творчая лабараторыя па вырабу закладак для кніг, конкурс дзіцячага буклука *”Любімых кніг старонкі запаветныя“*, лялечнае прадстаўленне *”Прыгоды кніжкі і дзяўчынкі Марышкі“*. У першы дзень Тыдня супрацоўнікі **Глыбоцкай дзіцячай бібліятэкі** правялі літаратурна-тэатралізаванае свята ”Няхай кніжка стане святам для вас!“ для вучняў пачатковых класаў школ горада. Як звычайна, ганаровай госцяй свята была Каралева Кніга. Удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з творчасцю С. Міхалкова, якому споўнілася 110 гадоў з дня нараджэння. Паўдзельнічалі ў літаратурных конкурсах *”Уважлівы чытач“*, *”Прадоўжы верш“*, *”Чароўныя словы“* і весела патанчылі пад ”Песеньку сяброў“, пагулялі з паветранымі шарыкамі, а таксама праспявалі песню ”Маленькая краіна“. Прыемна здівілі ўдзельнікаў свята казачныя персанажы – Кікімара-мама і Кікімара-дачка. Напрыканцы мерапрыемства самыя актыўныя чытачы атрымалі ў падарунак кніжкі. Бібліятэкары **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэкі** арганізавалі адкрыццё Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі ў літаратурна-музычнай гасцёўні, дзе адбылася літаратурная сустрэча *”Дед Природовед о тайнах и загадках природы“* з удзелам вядомых аршанскіх пісьменнікаў, членаў Віцебскага абласнога аддзялення ”Саюз Пісьменнікаў Беларусі“ Галінай і Сяргеем Трафімавымі. На мерапрыемстве пісьменнікі ў гульнявой форме расказалі пра свае кнігі, а дзеці вельмі актыўна і з задавальненнем адказвалі на пытанні, спрабуючы разам з аўтарамі разгадаць загадкі прыроды. Сустрэча прайшла ў шчырай, цёплай і сяброўскай атмасферы. А напрыканцы ўсе прысутныя маглі атрымаць аўтографы любімых пісьменнікаў і сфатаграфавацца з імі на памяць. Урачыстае закрыццё Тыдня адбылося пад назвай *”Книжкины именины“* і стала сапраўдным святам, з казачнымі героямі, шумнымі гульнямі і песнямі. Ганаровым госцем мерапрыемства стала вядомая пісьменніца Ірына Андрэеўна Багданава. Падчас мерапрыемства былі ўзнагароджаны пераможцы дзіцячага конкурсу на лепшага чытача беларускай кнігі *”З родным словам, ды з беларускаю душою“* і раённага літаратурнага конкурсу *”Слаўлю цябе, беларуская мова“*. У 2023 годзе галоўнае мерапрыемства года ў **дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога – філіяле № 1 Полацкай РЦБС** праходзіла пад дэвізам *”Интереснее – читать!“*. Верш пад такой назвай напісала Тамара Краснова-Гусачэнка, старшыня Віцебскага абласнога аддзялення ”Саюз пісьменнікаў Беларусі“, і падчас свята яго выразна чыталі чытачы бібліятэкі. Гасцей мерапрыемства чакала сустрэча с Нязнайкам, дзяўчынкай Літаркай, Бабай Ягой і Паштальёнам Печкіным. Разам ім удалося адшукаць пасылку Каралевы Кнігі, у якой былі ўзнагароды для лепшых чытачоў 2023 года, а таксама пасланне для тых, хто





## Сацыякультурная дзейнасць

| № | ЦБС | Арганізавана і праведзена | | | | | Рэалізавана | | Клубы | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | мерапрыемстваў | | акцый | майстар-класаў | мастацкіх выстаў | праграм | праектаў | адзінак | удзельнікаў |
| | | усяго | анлайн | | | | | | | |
| 1 | Бешанковіцкая | 44 | 0 | 0 | 1 | 3 | 1 | 3 | 1 | 15 |
| 2 | Браслаўская | 283 | 0 | 3 | 3 | 11 | 2 | 0 | 1 | 31 |
| 3 | Верхнядзвінская | 45 | 3 | 11 | 3 | 3 | 1 | 0 | 1 | 19 |
| 4 | Глыбоцкая | 108 | 0 | 10 | 1 | 1 | 3 | 0 | 3 | 72 |
| 5 | Докшыцкая | 137 | 0 | 3 | 10 | 0 | 3 | 4 | 2 | 23 |
| 6 | Лепельская | 133 | 0 | 4 | 0 | 19 | 1 | 2 | 2 | 32 |
| 7 | Мёрская | 72 | 0 | 6 | 8 | 11 | 2 | 0 | 1 | 12 |
| 8 | Аршанская | 215 | 0 | 19 | 6 | 12 | 2 | 6 | 2 | 52 |
| 9 | Полацкая | 496 | 0 | 4 | 85 | 5 | 8 | 3 | 2 | 42 |
| 10 | Пастаўская | 105 | 0 | 10 | 1 | 2 | 0 | 1 | 1 | 26 |
| 12 | Сенненская | 114 | 0 | 3 | 0 | 3 | 0 | 1 | 2 | 24 |
| 13 | Талачынская | 92 | 0 | 5 | 2 | 1 | 1 | 1 | 3 | 26 |
| 14 | Чашніцкая | 419 | 0 | 14 | 9 | 16 | 2 | 2 | 4 | 106 |
| 15 | Шаркаўшчынская | 59 | 0 | 5 | 1 | 10 | 0 | 1 | 1 | 8 |
| 16 | Шумілінская | 205 | 0 | 56 | 12 | 0 | 0 | 0 | 1 | 12 |
| | **Усяго па РЦБС** | **2527** | **3** | **153** | **142** | **97** | **26** | **24** | **28** | **500** |
| 17 | г. Віцебск | 1182 | 0 | 19 | 39 | 28 | 3 | 7 | 4 | 44 |
| 18 | г. Наваполацк | 498 | 1 | 12 | 0 | 9 | 8 | 8 | 1 | 26 |
| | **Усяго па ГЦБС** | **1680** | **1** | **31** | **39** | **37** | **11** | **15** | **5** | **70** |
| | **УСЯГО** | **4207** | **4** | **184** | **181** | **134** | **37** | **39** | **33** | **570** |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | E-mail: libr_kolasa@cbsvit.by |
| Чарнова Наталля Юр'еўна | Бібліятэка-філіял № 11 імя М. Лынькова | аўт. – пт. 10.00 – 19.00 сб., нд. 10.00 – 18.00 | панядзелак | 1-шы чацвер месяца | 210007 г. Віцебск, вул. Зеленагурская, 14 Тэлефон: 8-0212-26-31-35 E-mail: libr_linkova@cbsvit.by |
| Есіпенка Іна Валяр'янаўна | Бібліятэка-філіял № 12 імя М. Астроўскага | 11.00 – 19.00 | пятніца | 1-шы панядзелак месяца | 210024 г. Віцебск, вул. Дзімітрава, 34 Тэлефон: 8-0212-64-90-26 E-mail: library12@cbsvit.by |
| Ражноўская Галіна Іванаўна | Бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча | аўт. – пт. 09.00 – 19.00 сб., нд. 10.00 – 18.00 | панядзелак | 1-шы аўторак месяца | 210029 г. Віцебск, пр-т Маскоўскі, 64 Тэлефон: 8-0212-37-02-77 E-mail: bibliokor@cbsvit.by |
| **ЦБС г. Наваполацка** | | | | | |
| Хватынец Таццяна Вячаславаўна | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака | пн. – пт. 10.00 – 19.00 сб. 10.00 – 18.00 | нядзеля | апошні дзень месяца | 211447 г. Наваполацк, вул. Маладзёжная, 106 Тэлефон: 8-0214-50-39-92 E-mail: cbs@npkultura.by |
| Варанец Таццяна Валер'еўна | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А. Пушкіна | пн. – пт. 10.00 – 19.00 сб. 10.00 - 18.00 | нядзеля | апошняя серада месяца | 211446 г. Наваполацк, вул. Юбілейная, 1 Тэлефон: 8-0214-57-24-84 E-mail: cbs@npkultura.by |



любіць і шануе кнігу. Таксама у рамках Тыдня прайшлі казачны калейдаскоп *"Сказки-подсказки В. Сутеева"*, літаратурныя імяніны *"И наши бабушки, и мы, все в Михалкова влюблены"*, творчыя заняткі ў студыі гульнявога чытання "Смышлёныш" *"Весна шагает быстрыми шагами"* і творчая сустрэча *"Дружная семейка"* з пісьменніцай Ірынай Багданавай. Незабыўнай стала сустрэча школьнікаў малодшых класаў сярэдніх школ № 2 і № 6 г. Оршы з пісьменнікамі-землякамі Галінай Уладзіміраўнай і Сяргеем Анатольевічам Трафімавымі ў **дзіцячай бібліятэцы імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС** падчас святкавання Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі. Разам з аўтарамі дзеці адправіліся на пошукі кніг серыі "Рассказы Деда Природоведа", якія былі скрадзены Старухай Шапакляк і злымі піратамі. Шапакляк пастаянна заблытвала сляды, задавала складаныя пытанні, зашыфравала назвы кніг. Хлопчыкі і дзяўчынкі справіліся з усімі заданнямі, кнігі былі знойдзены, а піраты пакараны. Інтрыга трымалася да самага канца: ніхто з дзяцей не мог выказаць здагадку, што галоўным сюрпрызам стане сустрэча з аўтарамі кніг серыі "Рассказы Деда Природоведа". Займальная сустрэча працягвалася доўга. Пісьменнікі расказвалі пра дзіўны свет жывёл і раслін, пра сваю творчасць, дзяліліся сакрэтамі майстэрства, задавалі няпростыя пытанні. За кожны правільны адказ дзяцей чакаў салодкі пачастунак. Школьнікі засталіся ўдзячныя аўтарам за сустрэчу і бібліятэкарам за арганізацыю бук-вояжа *"Саквояж с чудесами"*, за цудоўна праведзены час у дзіцячай бібліятэцы імя У. Караткевіча.

## Патрыятычнае выхаванне

Грамадзянска-патрыятычны напрамак з'яўляецца неад'емнай часткай выхаваўчай работы і рэалізуецца праз правядзенне мерапрыемстваў рознага фармату: фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі; работа з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны; удзел у мерапрыемствах, прысвечаных Дню Перамогі, Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, Дню абаронца Айчыны; экскурсійныя праграмы па гістарычных мясцінах Беларусі, месцах баявой і партызанскай славы, пахаванняў ахвяр генацыду беларускага народа.

Істотная роля ў прасоўванні чытання, асабліва патрыятычнага накірунка, складае выставачная дзейнасць бібліятэк, якая найлепшым чынам дапамагае раскрыць багацце кніжнага фонду кожнай бібліятэкі: *"В сердцах и книгах память о Войне"* (**дзіцячая бібліятэка Шумілінскай ЦБС**), *"Пераможныя, незабыўныя 45-ы!"* (**Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка**), *"От сердца каждая строка"* (**дзіцячая бібліятэка Лепельскай ЦБС**), *"Болью в сердце"* (**дзіцячая бібліятэка Шаркаўшчынскай ЦБС**). Разам з тым, да кожнага мерапрыемства, якое праводзіцца бібліятэкарамі, падбіраюцца наглядныя матэрыялы:

відэаролікі, прэзентацыі, фільмы, актыўна выкарыстоўваюцца мультымедыйныя сродкі, якія з'яўляюцца яркім дадаткам.

Шмат станоўчых водгукаў атрымала **Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1**. Яна прапанавала падлеткам прыняць удзел у гульні-падарожжы *”Мы патриоты Родины своей“*. На станцыі *”Историческая“* школьнікі пазнаёміліся з помнікамі, прысвечанымі падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Бібліятэкар расказала ўдзельнікам мерапрыемства пра мемарыяльныя комплексы ”Брестская крепость“, ”Прорыв“, ”Хатынь“, ”Красный берег“ і подзвігі юных герояў. Дзеці паўдзельнічалі ў гульнях *”Разведчики“* і *”Связисты“*. На станцыі *”Знаменитые белорусы“* вучні ўспомнілі пра Е. Полацкую, Ф. Скарыну, Я. Купалу і паспрабавалі свае сілы ў конкурсе *”Космические испытания“*. Пра ўнікальнасць і асаблівасці беларускай мовы нагадала станцыя *”Культурная“*. На ёй дзеці прынязеці ўдзел у гульні *”Роднае слова“*, конкурсе *”Лепшы гаварун“*. Станцыя *”Милый сердцу уголок“* была прысвечана г. Глыбокае. З дапамогай гульні *”Загадки на улицах города“* школьнікі ўзгадалі самыя значныя аб'екты горада і назвы вуліц, дзе яны размяшчаліся.

На базе **Новалукомльскай дзіцячай бібліятэкі** з нагоды 105-годдзя УЛКСМ адбыўся круглы стол *”Душою малады камсамол“* з удзелам двух пакаленняў. На сустрэчы прысутнічалі ганаровыя госці – старшыня і намеснік старшыні Новалукомльскага гарвыканкама, а таксама людзі, якія стаялі ля вытокаў будаўніцтва горада і Лукомскай ДРЭС. Падчас мерапрыемства прагучала мноства пытанняў па гісторыі камсамола да старэйшага пакалення членаў гэтай арганізацыі, былі ўзняты важныя жыццёвыя пытанні. Напрыканцы мерапрыемства прысутныя напісалі паштоўку-пасыл у будучыню маладому пакаленню.

Станоўчым прыкладам партнёрскіх адносін двух устаноў культуры стала сумесная праца **дзіцячай раённай бібліятэкі Бешанковіцкай ЦБС** і Бешанковіцкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея. Вынікам такой пленнай працы стала тэматычная сустрэча *”Трагедыя яўрэйскай абшчыны г.п. Бешанковічы“*, якая была прымеркавана да 81-й гадавіны растрэлу вязняў Бешанковіцкага гета. На мерапрыемства былі запрошаны госці з Санкт-Пецярбурга Ганна Уладзіміраўна Клімовіч і Ірына Аляксандраўна Агурцова, якія займаюцца аднаўленнем яўрэйскіх могілак і памяці пра бешанковіцкі штэтл. На мерапрыемстве прысутнічалі вучні школ і жыхары гарадскога пасёлка. Школьнікі і госці пазнаёміліся з фактамі генацыду, якія адбываліся ў Бешанковіцкім раёне. У гады акупацыі загінула 95% яўрэйскага насельніцтва. Страшнымі помнікамі Халакосту з'яўляюцца брацкія магілы ў Бешанковічах, аграгарадках Астроўна і Ула, а таксама каля вёскі Слабада.

У Віцебскай вобласці асаблівае значэнне маюць мерапрыемствы, прысвечаныя Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, які штогод святкуецца ў Рэспубліцы Беларусь 15 лютага. Карыстальнікі **Новалукомльскай дзіцячай бібліятэкі Чашніцкай РЦБС** пазнаёміліся з жывымі сведкамі афганскіх падзей падчас сустрэчы *”Вайна прайшлася па*



| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | бібліятэка-філіял № 1 | 14.00 – 18.00 | | | 8-02135-4-10-76<br>E-mail:<br>detbibsenno@yandex.by |
| **Талачынская ЦБС** | | | | | |
| Жанткоўская Вольга Аляксандраўна | Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 | 10.00 – 19.00 | панядзелак | апошні чацвер месяца | 211092<br>г. Талачын,<br>вул. Набярэжная, 14<br>Тэлефон:<br>8-02136-5-24-97<br>E-mail:<br>detskbibltol@yandex.by |
| **Чашніцкая ЦБС** | | | | | |
| Рубан Галіна Іванаўна | філіял ”Чашніцкая раённая дзіцячая бібліятэка імя Янкі Журбы“ | 8.00 – 19.00 | пятніца | апошні чацвер месяца | 211149<br>г. Чашнікі,<br>вул. Ленінская, 10а<br>Тэлефон:<br>8-02133-4-11-45<br>E-mail:<br>detbib134@gmail.com |
| Казінец Галіна Цімафееўна | філіял ”Нова-лукомльская гарадская бібліятэка“ | 9.00 – 19.00 | пятніца | апошні чацвер месяца | 211162<br>Чашніцкі раён,<br>г. Новалукомль,<br>вул. Набярэжная, 13<br>Тэлефон:<br>8-02133-3-45-93<br>E-mail:<br>z6080156@gmail.com |
| **Шаркаўшчынская ЦБС** | | | | | |
| Паляк Тамара Эдвардаўна | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | пн. – чц.<br>9.00 – 18.00<br>сб. – нд.<br>9.00 – 18.00<br>абед<br>13.00 – 14.00 | пятніца | апошні чацвер месяца | г.п. Шаркаўшчына,<br>вул. Камсамольская,8<br>Тэлефон:<br>8-02154-6-19-18<br>E-mail: db-shark@yandex.by |
| **Шумілінская ЦБС** | | | | | |
| Бароўкіна Анжаліка Анатольеўна | Дзіцячая бібліятэка | аўт. – пт.<br>08.00 – 19.00<br>сб. – нд.<br>10.00 – 19.00<br>абед<br>13.00 – 14.00 | панядзелак | першая пятніца месяца | 211259<br>гп. Шуміліна,<br>вул. Ленінская, 17<br>Тэлефон:<br>8-02130-5-73-85<br>E-mail:<br>detskaia_biblioteka_shumilino@mail.ru |
| **ЦБС г. Віцебска** | | | | | |
| Зуева Святлана Вячаславаўна | Бібліятэка-філіял № 9 імя С. Маршака | пн. – чц.<br>10.00 – 19.00<br>сб., нд.<br>10.00 – 18.00 | пятніца | 1-шы панядзе-лак месяца | 210009<br>г. Віцебск,<br>пр-т Фрунзэ, 60<br>Тэлефон:<br>8-0212-26-25-10<br>E-mail:<br>childlib@cbsvit.by |
| Чарнушына Таццяна Аляксандраўна | Бібліятэка-філіял № 10 імя Я. Коласа | аўт. – пт.<br>10.00 – 19.00<br>сб., нд.<br>10.00 – 18.00 | панядзелак | 1-шы чацвер месяца | 210008<br>г. Віцебск,<br>вул. М.Горкага, 120<br>Тэлефон:<br>8-0212-36-26-44 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Мёрская ЦБС** | | | | | |
| Пальчэх Святлана Леанідаўна | Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка | аўт. – нд. 9.00 – 18.00 | панядзелак | апошні чацвер месяца | 211287 г. Мёры, вул. Горкага, 5 Тэлефон: 8-02152-4-16-24 E-mail: miori.det.bibl@yandex.ru |
| **Аршанская ЦБС** | | | | | |
| Савіцкая Наталля Анатольеўна | Дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча, філіял № 1 | 10.00 – 19.00 | панядзелак | апошні дзень месяца | г. Орша, вул. Леніна, 6а Тэлефон: 8-0216-51-16-49 E-mail: bibliotekakorotkevicha@mail.ru |
| Палітава Жанна Анатольеўна | Дзіцячая бібліятэка імя Н. Крупскай, філіял № 8 | 10.00 – 19.00 | пятніца | апошні дзень месяца | г. Орша, вул. Івана Чарняхоўскага, 5а Тэлефон: 8-0216-51-30-40 E-mail: biblioteka.n.krupskoy@mail.ru |
| **Полацкая РЦБС** | | | | | |
| Бандарэнка Вольга Уладзіміраўна | Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1 | пн. – сб. 10.00 – 19.00 | нядзеля | апошні дзень месяца | 211401 г. Полацк, вул. Свярдлова, 17 Тэлефон: 8-0214-46-26-33 E-mail: detbibl.tolstoy@mail.ru |
| Еўдакімава Валянціна Леанідаўна | Дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы – філіял № 6 | аўт. – сб. 10.00 – 19.00 | нядзеля, панядзелак | апошні дзень месяца | 211406 г. Полацк, вул. Ленінградская, 47а Тэлефон: 8-0214-46-29-63 E-mail: library.office6@gmail.com |
| **Пастаўская ЦБС** | | | | | |
| Іванова Марына Мікалаеўна | Раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі – філіял № 1 | пн. – чц. 10.00 – 19.00 сб. – нд. 10.00 – 18.00 | пятніца | апошняя серада месяца | 211875 г. Паставы, пл. Леніна, д.21а Тэлефон: 8-02155-2-36-62 E-mail: child.poslib@gmail.com |
| **Сенненская ЦБС** | | | | | |
| Гарбачова Тацяна Рыгораўна | Сенненская дзіцячая раённая | аўт. – пт. 8.00 – 18.00 сб. – нд. 9.00 – 13.00 | панядзелак | апошні чацвер месяца | 211117 г. Сянно, вул. Савецкая, 13 Тэлефон: |



*гэтых лёсах"*. На мерапрыемства прыйшлі ветэраны-афганцы М. Завальны і А. Азарэвіч, якія падзяліліся сваімі ўспамінамі пра службу. Мерапрыемства дапаўнялі відэаролікі, прэзентацыі, песні пра Афганскую вайну і выстава-хроніка *"У полымі Афганістана"*.

Асобай увагі заслугоўваюць мерапрыемствы, прысвечаныя 80-годдзю Хатынскай трагедыі. Пра жахлівыя падзеі тых далёкіх дзён, якія адбыліся ў вёсцы Хатынь у 1943 годзе, пра гісторыю стварэння мемарыяльнага комплексу "Хатынь" узгадалі падчас літаратурна-музычнай кампазіцыі *"У сэрцы кожнага памятны след"* супрацоўнікі **Чашніцкай раённай дзіцячай бібліятэцы імя Янкі Журбы**. Ганаровым госцем мерапрыемства стала В.А. Башукова, ветэран працы, грамадскі дзеяч Чашніцкага раёна. Дапоўнілі мерапрыемства прэзентацыі *"Беларусь памятае"*, *"Хатынь"* і відэаролік *"Трагедыя Хатыні"*. У **дзіцячай бібліятэцы імя Н. Крупскай Аршанскай ЦБС** прайшоў урок памяці *"Хатыні боль у сэрцах людзей"*. Мерапрыемства было падрыхтавана ў рамках гісторыка-патрыятычнага праекта "Помним. Славим. Гордимся" для вучняў 8-х класаў ДУА "Сярэдняя школа № 5 г. Орша". Гасцямі і актыўнымі ўдзельнікамі мерапрыемства сталі памочнік пракурора пракуратуры Аршанскага раёна Сяргей Анатольевіч Дзяржыцкі, старшы навуковы супрацоўнік ваенна-гістарычнага музея імя Героя Савецкага Саюза К.С. Заслонава Ганна Мікалаеўна Сасноўская.

Традыцыйна, 9 мая каля будынка Цэнтральнай раённай бібліятэкі Талачынскай ЦБС размясцілася тэматычная пляцоўка *"Вясна Перамогі"*, да якой далучыліся супрацоўнікі **Гарадской дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 49**. Увазе жыхароў і гасцей горада была прадстаўлена кніжна-ілюстраваная выстава *"Далёкай мужнасці памяць захоўваючы"* з інтэрактыўнай віктарынай *"Павінен ведаць кожны"*. Пакруціць кола-барабан і адказаць на прапанаваныя пытанні праявілі жаданне больш за 40 чалавек. Усе ўдзельнікі віктарыны атрымалі ў падарунак буклеты *"Вайна ў творчасці беларускіх пісьменнікаў"* і *"Вайной абарваныя радкі"*. Для маленькіх наведвальнікаў пляцоўкі супрацоўнікі арганізавалі тэматычную кніжную выставу "Маленькія героі Вялікай вайны" з інтэрактыўнай віктарынай "Па старонках Вялікай Перамогі" і майстар-класам па вырабу галубоў міру ў стылі арыгамі. У **Докшыцкай дзіцячай бібліятэцы**, напярэдадні свята Вялікай Перамогі, прайшоў Тыдзень патрыятычнай літаратуры *"Памяць палаючых гадоў"*. Увазе чытачоў была прадстаўлена кніжная выстава *"Дзеля міру на зямлі"*. Дзецям, супрацоўнікі бібліятэкі, прапанавалі прыняць удзел у квэст-гульні *"Яшчэ раз пра вайну"*. **Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1 Полацкай РЦБС** падрыхтавала патрыятычны ўрок *"Сороковые, роковые, военные, пороховые"*, які быў прысвечаны гісторыі горада. Бібліятэкар расказала дзецям аб устанаўленні ў Полацку акупацыйнага рэжыму, падрабязна спынілася на гісторыі Полацкага гета, распавяла пра знішчэнне фашыстамі 8 тысяч яўрэяў, зачытала паказанні былых вязняў, якія засталіся ў жывых.

## Эстэтычнае выхаванне

Эстэтычнае выхаванне, далучэнне дзяцей да скарбніцы сусветнай культуры і мастацтва – найважнейшыя складаныя фарміравання ўсебаковаразвітай асобы. Таму ў **бібліятэцы імя Л. Талстога – філіяле № 1 Полацкай РЦБС** распрацаваны план па маральна-эстэтычнаму выхаванню *”В гостях у Мэри Поппинс“*. У рамках плана вучні 1-га ”А“ класа ДУА ”Сярэдняя школа № 10 імя У.М. Азіна“ наведалі музычна-літаратурную гасцёўню *”Сказка в музыке“*, прысвечаную 395-годдзю з дня нараджэння Ш. Перо. Дзеці пазнаёміліся з жыццём і творчасцю пісьменніка і прынялі ўдзел у літаратурнай гульні. Раздзяліўшыся на каманды, яны адгадвалі герояў па апісанні, казку па ілюстрацыях і прадметах, загадкі пра казачных герояў. Падчас мастацка-гістарычнага экскурса *”Почему мы так одеты“* вучні 4-га ”Б“ класа ДУА ”Сярэдняя школа № 10 імя У.М. Азіна“ здейснілі падарожжа ў мінулае. Дзеці пазнаёміліся з традыцыямі касцюма Старажытнага Егіпта, Грэцыі і рымлян. Пагаварылі пра гісторыю слова ”мода“, даведаліся, якія галаўныя ўборы і абутак насілі мужчыны і жанчыны ў Францыі і Італіі. У госці да дзяцей завітаў герой верша С. Маршака ”Вот какой рассеянный“, якому ўдзельнікі мерапрыемства дапамаглі правільна апранущца і абуцца. Дзеці паказалі свае веды і ўменні ў гульнях *”Гардэроб“* і *”З чаго шыюць вопратку“*. Папулярнасць набываюць **майстар-класы**, якія даюць магчымасць кожнаму, хто валодае пэўнымі здольнасцямі, праявіць сябе ў творчасці. Так, падчас навагодніх святаў чытачы прымалі ўдзел у майстар-класе *”Серый, белый и пушистый“*, напярэдадні дня Абаронца Айчыны з кардону выраблялі пагранічнага сабаку (майстар-клас *”Чуткий слух, тонкий нюх“*). У летні перыяд адбыліся майстар-класы *”Очки для солнечного лета“*, *”Я – веселый рыжий клоун“*, *”Дети. Вода. Безопасность“*, *”Деревянный мальчуган – БУ-РА-ТИ-НО“*, *”В фокусе – Пушкин“*.

Пасяхова быў адзначаны Сусветны дзень чытання ў **Падсвільскай дзіцячай бібліятэцы Глыбоцкай ЦБС**, які прайшоў пад назвай *”Што люблю, тое і прачытаю“*. Кожны наведвальнік бібліятэкі змог пагрузіцца ў свет паэзіі прачытаўшы ўслых кароткі ўрывак з любімай кнігі. Дзеці выбіралі кнігі не толькі рускіх, але і беларускіх пісьменнікаў. Каб больш прыцягнуць увагу чытачоў да кнігі бібліятэкары арганізавалі акцыю *”Падарожжа кнігі“*, у якой прынялі ўдзел больш за 20 дзяцей. Першаму чытачу ўручайся ”дарожны ліст“. Прачытаўшы кнігу, удзельнік акцыі запісваў свае ўражанні ў гэты ліст і перадаваў кнігу наступнаму чытачу. Для чытання была абрана казка П. Яршова ”Канёк-гарбунок“.

На працягу чэрвеня кожную сераду для навучэнцаў 1–4-х класаў **Шумілінская дзіцячая бібліятэка** праводзіла кінагасцёўню *”Ажыўшыя карцінкі“* па казках рускіх пісьменнікаў. Падчас працы кінагасцёўні дзеці прагледзелі казкі Яўгена Шварца ”Казка пра страчаны час“, Пятра Яршова ”Канёк-гарбунок“, Самуіла Маршака ”Дванаццаць месяцаў“ і Аляксандра Пушкіна.





## Кантактныя дадзеныя

| Загадчык | Назва бібліятэкі | Час працы | Выходны дзень | Сан-дзень | Кантакты |
|---|---|---|---|---|---|
| **Браслаўская ЦБС** | | | | | |
| Кірчанка Валянціна Яўгенаўна | Дзіцячая бібліятэка | пн. – пт. 08.00 – 19.00 сб., нд. 10.00 – 19.00 | без выхадных | апошні чацвер месяца | 211969 г. Браслаў, вул. Савецкая, 108 Тэлефон: 8-02153-6-21-03 E-mail: detbibl-braslav@yandex.by |
| **Верхнядзвінская ЦБС** | | | | | |
| Марачкоўская Вікторыя Мікалаеўна | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 9.00 – 18.00 сб., нд: 09.00 – 18.00, перапынак: 13.00 – 14.00 | без выхадных | апошні чацвер месяца | 211631 г. Верхнядзвінск, вул. Савецкая, 34 Тэлефон: 8-02151-6-25-78 E-mail: dbibl-dvinsk@rambler.ru |
| **Глыбоцкая ЦБС** | | | | | |
| Андрыеўская Тацццяна Іванаўна | Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | аўт. – пт. 9.00 – 18.30 сб., нд. 9.00 – 17.00 | панядзелак | апошні чарвер месяца | 211800 г. Глыбокае, вул. Энгельса,41а Тэлефон: 8-02156-3-61-59 8-02156-3-61-21 glubokskayadetskaya @mail.ru |
| Каляга Аксана Іосіфаўна | Падсвільская дзіцячая бібліятэка-філіял № 2 | летні перыяд 10.00 – 19.00 перапынак 14.00 – 15.00 зімні перыяд 9.00 – 18.00 перапынак 13.00 – 14.00 | панядзелак | апошняя субота месяца | 211797 Глыбоцкі р-н, г.п. Падсвілье, вул. Юбілейная,89 Тэлефон: 8-02156-3-07-57 E-mail: bibl89@bk.ru |
| **Докшыцкая ЦБС** | | | | | |
| Гудзь Алена Уладзіміраўна | Докшыцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | аўт. – нд. 10.00 – 19.00 | панядзелак | другая пятніца месяца | 211720 г. Докшыцы, вул. Ленінская,14 Тэлефон: 8-02157-5-51-72 E-mail: dokdetlib@mail.ru |
| **Лепельская ЦБС** | | | | | |
| Доўнер Вольга Мікалаеўна | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | пн. – пт. 10.00 – 19.00 сб. – нд. 10.00 – 18.00 | без выхадных | першы чацвер месяца | 211174 г. Лепель, вул. Лабанка, д.35 Тэлефон: 8-02132-3-62-50 E-mail: lepeldb@mail.ru |

*Працяг табліцы*

| № | ЦБС | Чытальнасць | | Абарачальнасць | | Наведвальнасць | | Колькасць бібліятэчных работнікаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2022 | 2023 | 2022 | 2023 | 2022 | 2023 | Усяго |
| 1 | Бешанковіцкая | 17,2 | 11,6 | 1,3 | 0 | 7,8 | 5,2 | 17,2 |
| 2 | Браслаўская | 17,2 | 17,1 | 1,0 | 1,0 | 7,6 | 8,0 | 17,2 |
| 3 | Верхнядзвінская | 18,5 | 18,2 | 2,2 | 2,2 | 6,4 | 5,9 | 18,5 |
| 4 | Глыбоцкая | 19,5 | 19,2 | 1,7 | 1,7 | 8,0 | 7,4 | 19,5 |
| 5 | Докшыцкая | 16,5 | 14,8 | 1,6 | 1,5 | 8,8 | 8,7 | 16,5 |
| 6 | Лепельская | 21,7 | 21,3 | 2,7 | 2,8 | 9,2 | 9,1 | 21,7 |
| 7 | Мёрская | 15,1 | 15,0 | 1,5 | 1,6 | 7,3 | 7,4 | 15,1 |
| 8 | Аршанская | 19,9 | 19,8 | 1,8 | 1,8 | 6,1 | 6,1 | 19,9 |
| 9 | Полацкая | 17,5 | 17,5 | 2,4 | 2,7 | 7,4 | 7,3 | 17,5 |
| 10 | Пастаўская | 18,1 | 18,0 | 1,2 | 1,2 | 8,9 | 8,9 | 18,1 |
| 11 | Сенненская | 19,0 | 19,1 | 1,5 | 1,5 | 10,4 | 10,0 | 19,0 |
| 12 | Талачынская | 20,3 | 20,0 | 1,9 | 2,1 | 8,4 | 8,2 | 20,3 |
| 13 | Чашніцкая | 18,5 | 18,6 | 1,5 | 1,5 | 8,2 | 8,4 | 18,5 |
| 14 | Шаркаўшчынская | 14,9 | 14,8 | 1,3 | 1,3 | 8,0 | 8,0 | 14,9 |
| 15 | Шумілінская | 20,0 | 20,3 | 2,6 | 2,6 | 12,0 | 12,2 | 20,0 |
| | **Усяго па РЦБС** | **18,5** | **18,1** | **1,7** | **1,8** | **7,9** | **7,8** | **18,5** |
| 16 | г. Віцебск | 15,0 | 15,0 | 1,3 | 1,3 | 7,1 | 6,8 | 15,0 |
| 17 | г. Наваполацк | 15,2 | 15,1 | 1,2 | 1,3 | 6,9 | 7,0 | 15,2 |
| | **Усяго па ГЦБС** | **15,0** | **15,0** | **1,3** | **1,3** | **7,0** | **6,9** | **15,0** |
| | **УСЯГО** | **17,1** | **16,9** | **1,5** | **1,6** | **7,5** | **7,4** | **17,1** |



## Здаровы лад жыцця

Прывіццё навыкаў здаровага ладу жыцця можна лічыць найважнейшай задачай у выхаванні маладога пакалення. Мерапрыемствы праходзяць у гульнявой форме, спалучаючы ў сабе вялікі аб'ём карыснай інфармацыі і цікавую форму яе выкладу. Таксама супрацоўнікі дзіцячых бібліятэк будуюць сваю працу ў адпаведнасці з распрацаванымі праграмамі *”Мы за здоровый образ жизни!“* (**дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1 Полацкай РЦБС**) і праектамі *”Работать творчески, отдыхать активно, жить долго“* (**дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка**). Трэба адзначыць, што у гэтым напрамку было праведзена больш за 300 мерапрыемстваў.

З мэтай пашырэння ведаў моладзі аб згубнасці шкодных звычак бібліятэкі арганізоўвалі акцыі: *”К здоровью наперегонки“* (**Шумілінская дзіцячая бібліятэка**), *”Галасуй за здаровы лад жыцця“* (**Мёрская дзіцячая бібліятэка**).

Развіццю здаровага ладу жыцця садзейнічалі кніжныя экспазіцыі: *”Откажитесь от вредных привычек!“* (**Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка**), *”Твёрдое “нет” – это слово спасения“* (**Пастаўская дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі**), *”Сделай выбор в пользу здоровья“* (**дзіцячая бібліятэка імя Н. Крупскай Аршанскай ЦБС**), *”Солнце, воздух и вода – наши верные друзья“* (**бібліятэка-філіял № 10 імя Я. Коласа ЦБС г. Віцебска**).

Прафілактыка шкодных звычак, папулярызацыя здаровага ладу жыцця трывала ўвайшлі ў працу **Гарадской дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 49 Талачынскай ЦБС**. Для падрастаючага пакалення была праведзена гадзіна здароўя *”Тытунёвы туман падману“*, у ходзе якой навучэнцы даведаліся пра шкоду курэння электронных цыгарэт, паглядзелі відэафільм *”Сакрэты маніпуляцыі. Тытунь“* і пазнаёміліся з тэматычнай выставай *”Курэнне – небяспечная звычка“*. Шок-урок *”П'янству – бой, працуй над сабой“* для навучэнцаў 9-га класа СШ № 1 г. Талачына ўдакладніў наступствы ўжывання алкаголю. Дапоўнілі мерапрыемства тэматычная выстава-папярэджанне *”Цвяроза жыць – здарава“* і ралявая гульня *”Правакацыя“*.

Бяспечнай дозы тытуню не існуе – сцвярджаюць спецыялісты. Асабліва ён згубны для маладых неакрэплых арганізмаў. Папулярнасць вейпаў і электронных цыгарэт выклікае трывогу. У рамках рэспубліканскай антытытунёвай інфармацыйна-адукацыйнай акцыі, якая прайшла з 13 па 19 лістапада па ўсёй краіне, **Чашніцкая раённая дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы** правяла шэраг прафілактычных мерапрыемстваў. Падчас інфармацыйнай гадзіны *”Курэнне – небяспечная пастка“* навучэнцы 9-х класаў ДУА ”Сярэдняя школа № 4 г. Чашнікі“ азнаёміліся з гісторыяй з'яўлення тытуню і цыгарэт. Удзельнікі мерапрыемства расказалі, што яны думаюць аб згубнай звычцы і як ставяцца да сяброў, якія кураць. Прафілактычная квэст-гульня *”Міністэрства аховы здароўя папярэджвае…“* прайшла для навучэнцаў 7-га класа ДУА ”Чашніцкая гімназія“. Дзеці, падзяліўшыся на дзве каманды, удзельнічалі ў конкурсах:

*”Правер свае лёгкія“* (надзімалі паветраныя шарыкі), *”Эрудыт“* (вырашалі тэставыя заданні).

Да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам для навучэнцаў старэйшага школьнага ўзросту ДУА ”Сярэдняя школа № 1 г. Новалукомля імя Ф.Ф. Дуброўскага“ ў Новалукомльскай дзіцячай бібліятэцы Чашніцкай РЦБС адбыўся дыспут ”Наркотыкі – сурагат“ з удзелам псіхолага раённай бальніцы Т. Мароз. На мерапрыемстве былі абмеркаваны наступныя пытанні: як ставіцца да наркотыкаў, як спыніць распаўсюджванне наркаманіі, чаму падлеткі становяцца пацыентамі наркалагічных бальніц, як супрацьстаяць тым, хто прапануе паспрабаваць псіхаактыўныя рэчывы. Таксама разгледзелі прававыя аспекты – адміністрацыйную і крымінальную адказнасць за распаўсюджванне наркотыкаў. Галоўная выснова, якая была зроблена пасля заканчэння мерапрыемства – трэба жыць цікава, атрымліваючы задавальненне ад здаровага ладу жыцця, зносін адзін з адным і творчасці.

Дзень прафілактыкі суіцыдальных паводзін ”Жыццё чалавеку толькі раз даецца“ прайшоў у **Чашніцкай раённай дзіцячай бібліятэцы імя Я. Журбы**. Падчас канструктыўнага дыялогу *”Карысныя і шкодныя звычкі“* ўдзельнікі мерапрыемства высветлілі прычыны з’яўлення шкодных звычак: слабасць характару, дрэнная кампанія, жаданне быць дарослым ці простая цікаўнасць. Паспрабавалі знайсці шляхі выхаду са складаных сітуацый. Вучняў 9-га класа супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі з сацыяльным відэаролікам *”Я малюю шчасце…“*. Па выніках атрыманых ведаў навучэнцы сярэдняга і старэйшага звяна прынялі ўдзел у акцыі *”Галасуем за жыццё разам!“*, падчас якой кроплямі аптымістычных эмоцый і пазітыўнага настрою дзеці напаўнялі ”збан жыцця“.

## Выхаванне экалагічнай культуры

Экалагічная асвета моладзі з’яўляецца важнай і неад’емнай часткай працы бібліятэк. Рэалізуючы гэты напрамак сваёй дзейнасці, бібліятэкі вобласці на працягу года прапаноўвалі моладзі выставы, урокі экалогіі, віктарыны, гутаркі, пазнавальна-гульнявыя праграмы, розныя экалагічныя акцыі.

Распаўсюджванне экалагічнай асветы сярод дзяцей і падлеткаў праходзіць у рамках экалагічных клубаў – пляцовак для дыскусійных сустрэч на тэмы, звязаныя з прыродаахоўнай дзейнасцю, рашэннем экалагічных праблем, абменам досведам практычнай дзейнасці. Паспяхова ў гэм накірунку працуюць дзіцячая бібліятэка Верхнядзвінскай ЦБС (клуб ”Экоша“), Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка (клуб ”Юны эколаг“), дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога Полацкай РЦБС (клуб ”Экоша“). Аматарскія аб’яднанні налічваюць 71 удзельнка. У справаздачным годзе імі было праведзена 37 мерапрыемстваў, якія наведала 568 чалавек. Так, у рамках працы клуба ”Экоша“ **дзіцячай бібліятэкі Верхнядзвінскай ЦБС** для





| № | ЦБС | Бібліятэчны фонд (экз.) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | | | Пасту піла 2023 | Выбыла 2023 | % абн. фонду |
| | | 2022 | 2023 | +/- | | | |
| 1 | Бешанковіцкая | 20766 | 0 | -20766 | 358 | 21226 | 0 |
| 2 | Браслаўская | 33733 | 33738 | 5 | 620 | 660 | 1,8 |
| 3 | Верхнядзвінская | 12748 | 12705 | -43 | 775 | 818 | 6,1 |
| 4 | Глыбоцкая | 37518 | 35775 | -1743 | 1437 | 3735 | 4,0 |
| 5 | Докшыцкая | 21432 | 21792 | 360 | 761 | 696 | 3,5 |
| 6 | Лепельская | 21787 | 21468 | -319 | 858 | 1180 | 4,0 |
| 7 | Мёрская | 21121 | 20651 | -470 | 699 | 1169 | 3,4 |
| 8 | Аршанская | 85047 | 81111 | -3936 | 2351 | 6287 | 2,9 |
| 9 | Полацкая | 44553 | 39398 | -5155 | 1603 | 6758 | 4,1 |
| 10 | Пастаўская | 30896 | 30823 | -73 | 869 | 942 | 2,8 |
| 11 | Сенненская | 20608 | 20483 | -125 | 820 | 945 | 4,0 |
| 12 | Талачынская | 18917 | 17167 | -1750 | 457 | 2207 | 2,7 |
| 13 | Чашніцкая | 61684 | 62455 | 771 | 1941 | 2154 | 3,1 |
| 14 | Шаркаўшчынская | 18427 | 18388 | -39 | 901 | 1006 | 4,9 |
| 15 | Шумілінская | 11530 | 11794 | 264 | 442 | 178 | 3,7 |
| | **Усяго па РЦБС** | **460767** | **427748** | **-33019** | **14892** | **49961** | **3,5** |
| 16 | г. Віцебск | 229403 | 231433 | 2030 | 7105 | 5008 | 3,1 |
| 17 | г. Навапалацк | 121370 | 118941 | -2429 | 3018 | 5447 | 2,5 |
| | **Усяго па ГЦБС** | **350773** | **350374** | **-399** | **10123** | **10455** | **2,9** |
| | **УСЯГО** | **811540** | **778122** | **-33418** | **25015** | **60416** | **3,2** |

*Працяг табліцы*

| № | ЦБС | Наведванні | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2022 | План 2023 | 2023 | % | +/- |
| 1 | Бешанковіцкая | 12576 | 12900 | 7041 | 54,6 | -5535 |
| 2 | Браслаўская | 15273 | 16150 | 16182 | 100,2 | 909 |
| 3 | Верхнядзвінская | 9743 | 8800 | 9197 | 104,5 | -546 |
| 4 | Глыбоцкая | 25329 | 24800 | 23537 | 94,9 | -1792 |
| 5 | Докшыцкая | 18764 | 18300 | 19363 | 105,8 | 599 |
| 6 | Лепельская | 25345 | 25100 | 25366 | 101,1 | 21 |
| 7 | Мёрская | 15746 | 15000 | 15861 | 105,7 | 115 |
| 8 | Аршанская | 45989 | 45200 | 45771 | 101,3 | -218 |
| 9 | Полацкая | 45295 | 41100 | 45124 | 109,8 | -171 |
| 10 | Пастаўская | 18737 | 18700 | 18769 | 100,4 | 32 |
| 11 | Сенненская | 16603 | 16000 | 16017 | 100,1 | -586 |
| 12 | Талачынская | 15194 | 14400 | 14824 | 102,9 | -370 |
| 13 | Чашніцкая | 41214 | 40425 | 42542 | 105,2 | 1328 |
| 14 | Шаркаўшчынская | 12687 | 12600 | 12670 | 100,6 | -17 |
| 15 | Шумілінская | 18266 | 18500 | 18569 | 100,4 | 303 |
| | **Усяго па РЦБС** | **336761** | **327975** | **330833** | **100,9** | **-5928** |
| 16 | г. Віцебск | 142504 | 138250 | 138297 | 100,0 | -4207 |
| 17 | г. Наваполацк | 68021 | 68020 | 68997 | 101,4 | 976 |
| | **Усяго па ГЦБС** | **210525** | **206270** | **207294** | **100,5** | **-3231** |
| | **УСЯГО** | **547286** | **534245** | **538127** | **100,7** | **-9159** |



дзяцей 3-га класа СШ № 2 г. Верхнядзвінска прайшла экалагічная гульня *”Про зелёные леса и лесные чудеса“*. Падчас мерапрыемства бібліятэкары прэзентавалі экалагічны праект *”Захаваем прыроду разам“*. На стэндзе, які быў размешчаны ў фае дзіцячай бібліятэкі, былі ўстаноўлены спецыяльныя QR-кады, выкарыстоўваючы якія можна не толькі атрымаць карысную інфармацыю, але і пачуць гукі лесу і галасы яго жыхароў. У ходзе інфармацыйна-забаўляльнай праграмы *”Путешествие капельки“* дзеці падзяліліся на дзве каманды і, згодна атрыманых маршрутных лістоў, прайшлі выпрабаванні на экалагічных станцыях *”Экалагічны святлафор“*, *”Трэці лішні“*, *”Блакітная пошта“*, *”Асяроддзе пасялення“* і *”Экалагічнае лата“*. Для членаў клуба ”Юны эколаг“ **Глыбоцкай дзіцячай бібліятэкі** быў падрыхтаваны экалагічны рэпартаж *”Яны заўсёды побач“*. З прэзентацыі дзеці даведаліся, калі і для якой мэты быў створаны Сусветны дзень аховы жывёл, якія фактары ўплываюць на праблему знікнення жывёл і што ў нашай краіне і ва ўсім свеце робіцца для яе вырашэння. У рубрыцы *”Не адшукаць днём з агнём“* удзельнікі клуба пагарталі старонкі Чырвонай кнігі і пазнаёміліся з незвычайнымі і рэдкімі жывёламі. Да ўсіх, хто зацікавіўся гэтай тэмай і хацеў паглыбіць свае веды, была аформлена выстава *”Кніга трывогі – кніга надзей“*.

Сусветнаму дню аховы навакольнага асяроддзя прысвячалася экалагічная гульня-падарожжа *”У прыроды ёсць сябры – гэта мы, і я і ты!“* **Гарадской дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 49 Талачынскай ЦБС**. Разам з бібліятэкарам дзеці адправіліся ў падарожжа, каб высветліць значэнне паняцця ”экалогія“ і даведацца пра асноўныя экалагічныя праблемы сучаснасці. Удзельнікі мерапрыемства праявілі эрудыцыю, творчыя здольнасці і кемлівасць на станцыях *”Лес поўны цудаў“*, *”Крыжаванка“*, *”Птушыныя прыказкі“*. Кніжная выстава *”Які цудоўны гэты свет!“* дапоўніла мерапрыемства. Удзельнікамі лялечнага тэатра ”Ларчык“ быў паказаны лялечны спектакль *”Як жывёлы лес ратавалі“*.

У дзіцячай **бібліятэцы-філіяле № 3 імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка** для вучняў 6-7-х класаў гімназіі № 1 і 9-х класаў СШ № 10 адбылася інфармацыйна-дыялогавая сустрэча *”Чарнобыльская малітва“*. Госцем імпрэзы стаў заснавальнік і адміністратар самай вялікай групы ў сацыяльнай сетцы ВКонтакте ”Чарнобыль“ – Аляксей Чаронка. Першая частка сустрэчы была прысвечана гісторыі і асаблівасцям Чарнобыльскай катастрофы. Школьнікі даведаліся, як адбылася трагедыя, пра прычыны і метады змагання з наступствамі катастрофы. Далей Аляксей пазнаёміў дзяцей з беларускай зонай адчужэння, якая знаходзіцца ў Палескім радыяцыйна-экалагічным запаведніку. Паказаў зробленыя там фатаграфіі, расказаў, якія селішчы былі ліквідаваны з прычыны радыяцыйнага забруджання, прадэманстраваў дазіметр, з дапамогай якога ўсе жадаючыя змаглі вызначыць узровень радыяцыі ў памяшканні, а таксама адказаў на шматлікія пытанні школьнікаў.

21 чэрвеня ў **дзіцячай бібліятэцы імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС** адбылося адкрыццё выставы дзіцячых вырабаў з другасных рэсурсаў у рамках конкурсу *”Мусор смело – пустим в дело“*. Ва

ўрачыстай абстаноўцы, пры ўдзеле старшыні Аршанскай раённай арганізацыі ”Белая Русь“, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь І. Крачак, начальніка гарадской і раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя А. Няфёдава падвялі вынікі экалагічнага конкурсу вырабаў сярод дзяцей горада Оршы і Аршанскага раёна.

Супрацоўнікі **Пастаўскай дзіцячай бібліятэкі імя У. Дубоўкі** падчас воднага калейдаскопа *”Мой край сінявокі“* пазнаёмілі ўдзельнікаў мерапрыемства з самымі значнымі рэкамі і азёрамі Пастаўшчыны, з іх прыгажосцю і каштоўнасцю. Дзеці паказвалі іх на карце Пастаўскага раёна, называлі населеныя пункты, каля якіх знаходзяцца водныя аб’екты, слухалі цікавыя факты і мясцовыя легенды пра гэтыя рэкі і азёры.

Да Сусветнага дня аховы жывёл у **Новалукомльскай дзіцячай бібліятэцы Чашніцкай РЦБС** адбылася экалагічная вандроўка *”Птушыны свет роднага краю“* з удзелам арнітолага В. Кашчэева. Прысутныя пазнаёміліся з рознымі птушкамі, якія насяляюць краіну, з ”Чорнай кнігай інвазіўных відаў жывёл Беларусі“. Віталь Аляксандравіч расказаў і паказаў дзецям, чым і як акальцоўваюць птушак. Удзельнікі мерапрыемства пасродкам медыяпрэзентацыі пабывалі разам з арнітолагам на фотапаляванні па птушыных месцах Чашніцкага раёна.

*”Дзіўныя сцяжынкі балота Ельня“* – пад такой назвай прайшла пазнавальная хвілінка ў **Мёрскай дзіцячай раённай бібліятэцы**. Падчас мерапрыемства дзеці даведаліся, дзе ў Беларусі размешчаны самыя старыя балоты і пазнаёміліся з многімі цікавымі фактамі з жыцця балотных насельнікаў, а таксама паглядзелі відэафільм *”Заказнік Ельня – чароўнае царства Беларусі“* аб водна-азёрным комплексе, размешчаным на тэрыторыі раёна.

Вялікая ўвага дзіцячымі бібліятэкамі надавалася арганізацыі і правядзенню сацыяльна-экалагічных акцый, якія прываблівалі чытачоў розных узроставых груп і мелі вялікі грамадскі рэзананс: *”Мы з прыродай сябруем, смецце нам не патрэбна“* (**гарадская дзіцячая бібліятэка Талачынскай ЦБС**), *”Давайте сохраним природу!“* (**дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Верхнядзвінскай ЦБС**), *”Пернатый дозор“* (**Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1**), ”Сёння свята ў Зямлі…“ (**дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Чашніцкай РЦБС**).

Відавочны поспехі дзіцячых бібліятэк у межах праграмна-праектнай дзейнасці. Экалагічнай тэматыцы былі прысвечаны праекты *”Маленькие чудеса в большой природе“* (**дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Лепельскай ЦБС**), *”ЭкоДетки“* (**бібліятэка-філіял № 12 імя М. Астроўскага ЦБС г. Віцебска**) і праграмы *”В судьбе природы – наша судьба“* (**дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Верхнядзвінскай ЦБС**), *”Экологическая академия“* (**Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1**), *”Экалогія ад А да Я“* (**Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка**), *”Свет вакол нас“* (**Чашніцкая раённая дзіцячая бібліятэка імя Янкі Журбы**), *”Дети. Экология. Книга“* (**дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка**). Праект *”Маленькие чудеса в*





| № | ЦБС | Дакументавыдача | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2022 | План 2023 | 2023 | % | +/- |
| 1 | Бешанковіцкая | 27787 | 28000 | 15756 | 56,3 | -12031 |
| 2 | Браслаўская | 34557 | 34500 | 34520 | 100,1 | -37 |
| 3 | Верхнядзвінская | 28276 | 28200 | 28239 | 100,1 | -37 |
| 4 | Глыбоцкая | 62020 | 60800 | 61315 | 100,8 | -705 |
| 5 | Докшыцкая | 35007 | 32000 | 32826 | 102,6 | -2181 |
| 6 | Лепельская | 59840 | 59000 | 59071 | 100,1 | -769 |
| 7 | Мёрская | 32582 | 32000 | 32017 | 100,1 | -565 |
| 8 | Аршанская | 149798 | 147500 | 148244 | 100,5 | -1554 |
| 9 | Полацкая | 107099 | 105000 | 107265 | 102,2 | 166 |
| 10 | Пастаўская | 38089 | 38000 | 38090 | 100,2 | 1 |
| 11 | Сенненская | 30415 | 30200 | 30601 | 101,3 | 186 |
| 12 | Талачынская | 36479 | 36000 | 36071 | 100,2 | -408 |
| 13 | Чашніцкая | 93431 | 92530 | 94258 | 101,9 | 827 |
| 14 | Шаркаўшчынская | 23456 | 23000 | 23401 | 101,7 | -55 |
| 15 | Шумілінская | 30516 | 30000 | 30877 | 102,9 | 361 |
| | **Усяго па РЦБС** | **789352** | **776730** | **772551** | **99,5** | **-16801** |
| 16 | г. Віцебск | 301792 | 297910 | 304185 | 102,1 | 2393 |
| 17 | г. Наваполацк | 150004 | 150004 | 150000 | 100,0 | -4 |
| | **Усяго па ГЦБС** | **451796** | **447914** | **454185** | **101,4** | **2389** |
| | **УСЯГО** | **1241148** | **1224644** | **1226736** | **100,2** | **-14412** |

## Асноўныя паказчыкі дзейнасці дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці за 2022 год

| № | ЦБС | Сетка | Карыстальнікі | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2022 | План 2023 | 2023 | % | +/- |
| 1 | Бешанковіцкая | 0 | 1611 | 1610 | 1360 | 84,5 | -251 |
| 2 | Браслаўская | 1 | 2010 | 1950 | 2016 | 103,4 | 6 |
| 3 | Верхнядзвінская | 1 | 1527 | 1525 | 1555 | 102,0 | 28 |
| 4 | Глыбоцкая | 2 | 3177 | 3100 | 3186 | 102,8 | 9 |
| 5 | Докшыцкая | 1 | 2121 | 2225 | 2223 | 99,9 | 102 |
| 6 | Лепельская | 1 | 2755 | 2750 | 2777 | 101,0 | 22 |
| 7 | Мёрская | 1 | 2156 | 2100 | 2132 | 101,5 | -24 |
| 8 | Аршанская | 2 | 7516 | 7480 | 7502 | 100,3 | -14 |
| 9 | Полацкая | 2 | 6128 | 6100 | 6143 | 100,7 | 15 |
| 10 | Пастаўская | 1 | 2109 | 2100 | 2114 | 100,7 | 5 |
| 11 | Сенненская | 1 | 1602 | 1600 | 1600 | 100,0 | -2 |
| 12 | Талачынская | 1 | 1800 | 1800 | 1804 | 100,2 | 4 |
| 13 | Чашніцкая | 2 | 5050 | 4870 | 5061 | 103,9 | 11 |
| 14 | Шаркаўшчынская | 1 | 1579 | 1570 | 1580 | 100,6 | 1 |
| 15 | Шумілінская | 1 | 1523 | 1520 | 1522 | 100,1 | -1 |
| | **Усяго па РЦБС** | **19** | **42664** | **42300** | **42575** | **100,7** | **-89** |
| 16 | г. Віцебск | 5 | 20173 | 19723 | 20293 | 102,9 | 120 |
| 17 | г. Наваполацк | 2 | 9900 | 9900 | 9901 | 100,0 | 1 |
| | **Усяго па ГЦБС** | **7** | **30073** | **29623** | **30194** | **101,9** | **121** |
| | **УСЯГО** | **25** | **72737** | **71923** | **72769** | **101,2** | **32** |



*большой природе“* пачаў рэалізоўвацца з 2023 года ў **дзіцячай бібліятэцы-філіяле № 1 Лепельскай ЦБС** з мэтай прыцягнення дзяцей да чытання і развіцця іх творчага патэнцыялу праз сумесную дзейнасць педагогаў і бібліятэкараў. У якасці прыкладу напаўнення праграмы мерапрыемствамі можна адзначыць экагульню *”Зеленый цвет в природе“* для дзяцей з групы падоўжанага дня ДУА ”Сярэдняя школа № 1 г. Лепеля“. Падчас гульні дзеці адправіліся ў зялёнае каралеўства, дзе змаглі паслухаць шум дрэў, спевы птушак, галасы іншых насельнікаў прыроды. Усе гульні і заданні былі звязаны з зялёным колерам, якія былі схаваныя ў зялёныя шары. Дзеці спявалі песні пра зялёнага коніка, пра пацешных жабянят, адгадвалі ”зялёныя“ загадкі, гулялі ў гульню *”Зеленый крокодил“*. У канцы мерапрыемства быў абраны самы ”зялёны“ удзельнік мерапрыемства. У яго адзенні прысутнічаў зялёны колер. **Бібліятэка-філіял № 12 імя М. Астроўскага ЦБС г. Віцебска** ў справаздачным годзе таксама пачала рэалізацыю новага экалагічнага праекта *”ЭкоДетки“* ў партнёрстве з СШ № 21. У ідэю праекта былі пакладзены асновы фарміравання экалагічнай культуры ў малодшых школьнікаў з выкарыстаннем інтэрактыўных наглядных формаў работы. Асобную ўвагу заслугоўвае экаакцыя *”Ладошки добра“*, для якой дзеці прынеслі з сабой для птушак семечкі, проса, грэчку і разам з бібліятэкарам павесілі кармушку ў ”бібліятэчным парку“.

Такім чынам, бібліятэкары дзіцячых бібліятэк набылі значны і разнастайны вопыт працы ў галіне экалогіі і ўстойлівага развіцця, які з кожным годам расце. Роля бібліятэк у фармаванні экалагічнага светапогляду стала найбольш прыкметная. Вопыт, назапашаны дзіцячымі бібліятэкамі і іх работа па экалагічнай асвеце дзяцей і падлеткаў, дазваляюць казаць аб тым, што фарміраванне эколага-інфармацыйнай культуры непаўналетніх стала новай, актуальнай функцыяй бібліятэк у сучасным свеце.

## Сямейнае выхаванне

У сваёй рабоце бібліятэкары рэгіёна стараюцца ахапіць бібліятэчным абслугоўваннем не толькі такія катэгорыі як дзеці, падлеткі або пенсіянеры, але і сям’ю ў цэлым.

Рэспубліканскі Тыдзень бацькоўскай любові – гэта тыя самыя дні, калі ўсе мамы і таты змогуць адчуць святочную атмасферу не толькі таму, што ў кагосьці дзень нараджэння або Новы год у календары, але таму, што яны проста бацькі, яны нарадзілі на свет дзяцей, дапамаглі ім зрабіць свае першыя крокі. **Чашніцкая раённая дзіцячая бібліятэка імя Янкі Журбы** для сваіх чытачоў арганізавала святочную праграму *”Отец. Отчество. Отцовство“*. Падчас мерапрыемства дзеці даведаліся пра гісторыю свята, калі і адкуль пайшла традыцыя святкавання Дня бацькі, як і ў якіх краінах яго адзначаюць. Пагаварылі аб тым, што такое Айчына, больш падрабязна

спыніліся на тэме Вялікай Айчыннай вайны, зачыталі лісты салдат з фронту сваім сем'ям. Акрамя гэтага, у дзіцячай бібліятэцы прайшла творчая акцыя *"Цёплыя словы аб бацьках"*. Дзяўчынкі і хлопчыкі прызнаваліся ў сваёй бязмежнай любові да сваіх бацькоў. Прыгожым дапаўненнем стала кніжная экспазіцыя *"Лепшы ў свеце тата мой"*, дзе былі сабраны самыя розныя кнігі, прысвечаныя татам.

Добрай традыцыяй у **Глыбоцкай дзіцячай бібліятэцы** стала правядзенне сумесных мерапрыемстваў дзяцей з іх бацькамі. Так, падчас правядзення гарадскога свята дзяцінства супрацоўнікі бібліятэкі запрасілі сваіх юных чытачоў і іх бацькоў на пазнавальна-забаўляльную гульню *"Морской круиз по Книжному океану"*. Удзельнікам прапанавалася разам прайсці 4 прыпынкі, дзе яны паказалі свае веды і кемлівасць. Першы прыпынак *"Избушка на курьих ножках"* прапаноўваў ім адгадаць 4 загадкі. Другі прыпынак *"Зелёный остров"* выклікаў асаблівую цікавасць. Адгадваючы загадкі пра жывёл, трэба было знайсці і іх сляды. На трэцім прыпынку *"Фонтан Неразгаданных тайн"* дзеці былі асабліва ўважлівыя, бо сярод літарнай блытаніны былі схаваныя прозвішчы дзіцячых пісьменнікаў. Вызначыць, якім літаратурным героям належаць страчаныя чароўныя рэчы, была ўмова на чацвёртым прыпынку *"Лес чудес"*. У канцы кожнага выпрабавання ўдзельнікі атрымлівалі запаветнае слова. І, прайшоўшы ўсе выпрабаванні, яны сабралі з усіх слоў сказ "Книга – твой друг, без неё как без рук". Бацькі разам з дзецьмі старанна падыходзілі да кожнага задання, уважліва і павольна выконвалі іх. Перамога ў гульні падняла настрой усім удзельнікам, і кожны атрымаў невялічкі падарунак.

Літаратурны караван *"Счастья и мира вашему дому"* адбыўся ў **Пастаўскай дзіцячай бібліятэцы імя У. Дубоўкі**. Удзельнікі мерапрыемства дзяліліся сваімі сямейнымі традыцыямі, абмяркоўвалі, што галоўнае ў моцнай сям'і. Вядучая ўзгадала прыказкі і прымаўкі на тэму сямейных узаемаадносін, зрабіла агляд літаратуры па тэме мерапрыемства. Таксама супрацоўнікі бібліятэкі прапанавалі чытачам акцыю *"Шануй сваіх бацькоў"*. Дзецям прапаноўвалася выказаць шчырыя пачуцці родным і непасрэдна з бібліятэкі патэлефанаваць маме ці тату, каб выказаць словы падзякі і любові.

Напярэдадні Дня сям'і бібліятэкары **Гарадской дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 49 Талачынскай ЦБС** арганізавалі і правялі святочна-гульнявую праграму ў гарадскім скверы. Наведвальнікам тэматычнай альтанкі *"Сям'я чытаннем моцная"* прапаноўвалася прыняць удзел у розных гульнях і конкурсах, расказаць прыказкі і адгадаць загадкі пра сям'ю. У гульнявой форме супрацоўнікі бібліятэкі давялі да наведвальнікаў галоўны сэнс свята: сям'я – крыніца любові, павагі, стабільнай і здаровай нацыі, гэта падмурак цывілізаванага грамадства і залог дабрабыту будучых пакаленняў. Кожны ўдзельнік атрымаў у падарунак буклет *"Мама, тата, я – чытаючая сям'я!"* і закладку *"Сямейны каляндар"*, а яшчэ зарад бадзёрасці і добрага настрою.



| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Новалукомльская дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 | |
| Шаркаўшчынская | 1 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | раённая |
| Шумілінская | 1 | Дзіцячая бібліятэка | раённая |
| **ГЦБС** | | | |
| г. Віцебск | 5 | Бібліятэка-філіял № 9 імя С. Маршака<br>Бібліятэка-філіял № 10 імя Я. Коласа<br>Бібліятэка-філіял № 11 імя М. Лынькова<br>Бібліятэка-філіял № 12 імя М. Астроўскага<br>Бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча | гарадская<br>гарадская<br>гарадская<br>гарадская<br>гарадская |
| г. Наваполацк | 2 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака<br>Дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А. Пушкіна | гарадская<br>гарадская |
| **Усяго** | **25** | | |

## Прафіляваныя дзіцячыя бібліятэкі Віцебскай вобласці

| № п/п | Назва ўстановы / профіль | Нумары / даты рашэнняў выканаўчых камітэтаў |
|---|---|---|
| 1 | Бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска – цэнтр краязнаўства | Загад па ЦБС г.Віцебска № 44 "Аб прафіліраванні бібліятэк" ад 15.02.2008 г. |

# ДАДАТКІ

*Дадатак 1*

## Дзіцячыя бібліятэкі Віцебскай вобласці

| **Віды дзіцячых бібліятэк** | **2022** | **2023** |
|---|---|---|
| раённыя | 13 | 12 |
| гарадскія | 12 | 12 |
| гарпасялковыя | 1 | 1 |
| **Усяго** | **26** | **25** |

| ЦБС | Сетка | Афіцыйныя назвы | Від |
|---|---|---|---|
| **РЦБС** | | | |
| Браслаўская | 1 | Дзіцячая бібліятэка | раённая |
| Верхнядзвінская | 1 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | раённая |
| Глыбоцкая | 2 | Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1<br>Падсвільская дзіцячая бібліятэка-філіял № 2 | раённая<br>гарпасял-ковая |
| Докшыцкая | 1 | Докшыцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | раённая |
| Лепельская | 1 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | раённая |
| Мёрская | 1 | Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка | раённая |
| Аршанская | 2 | Дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча, філіял № 1<br>Дзіцячая бібліятэка імя Н. Крупскай, філіял № 8 | гарадская<br>гарадская |
| Полацкая | 2 | Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1<br>Дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы – філіял № 6 | гарадская<br>гарадская |
| Пастаўская | 1 | Раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі – філіял № 1 | раённая |
| Сенненская | 1 | Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1 | раённая |
| Талачынская | 1 | Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 | раённая |
| Чашніцкая | 2 | філіял ”Чашніцкая раённая дзіцячая бібліятэка імя Янкі Журбы“ | раённая<br>гарадская |



## Духоўнае выхаванне

5 чэрвеня ў Дзень памяці нябеснай заступніцы Беларусі ў **дзіцячай бібліятэцы Шаркаўшчынскай ЦБС** адбылося адкрыццё выставы дзіцячых малюнкаў *”Её глаза – небо Беларусі“*. На выставе былі прадстаўлены 17 творчых работ навучэнцаў мастацкага аддзялення Шаркаўшчынскай дзіцячай школы мастацтваў. У сваіх працах юныя мастакі адлюстравалі вобраз прападобнай Еўфрасінні, выдатныя пейзажы любімага Полацка, партрэт Усяслава Чарадзея і многае іншае. Падчас мерапрыемства выступіў настаяцель Свята-Успенскай царквы, протаіерэй Пётр Бараноўскі, які пачынаў свой шлях святара пры Свята-Праабражэнскай царкве.

У рамках II раённых Калядных чытанняў у **Чашніцкай раённай дзіцячай бібліятэцы імя Янкі Журбы** прайшла духоўная сустрэча *”Пад ззяннем Каляднай зоркі“*. Бібліятэкар расказала дзецям пра Калядныя чытанні, якія аб’ядноўваюць мноства людзей – прадстаўнікоў духавенства, навучэнцаў устаноў адукацыі, студэнтаў, навукоўцаў з мэтай развіцця духоўна-маральных каштоўнасцей. Дырэктар Нядзельнай школы пры Храме Праабражэння Гасподняга Т. Плаўнік распавяла прысутным аб нараджэнні Ісуса Хрыста, пра гісторыю свята Каляды, расказала легенду пра тры дрэвы: пальму, масліну і елку, пра тое, чаму менавіта елка стала галоўным дрэвам Калядных і навагодніх святаў. Прэзентацыя спрыяла больш яркаму ўспрыманню інфармацыі. Дзеці самі спявалі песні і калядкі, чыталі вершы. Напрыканцы ўдзельнікі атрымалі сімвалічныя калядныя падарункі – Калядныя зорачкі з пажаданнем міру і дабра. У гэты дзень у бібліятэцы панавала сапраўдная святочная атмасфера.

**Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка** для навучэнцаў 7-га класа Мёрскай сярэдняй школы № 2 арганізавала сустрэчу з настаяцелем храма Палажэння Рызы Прасвятой Багародзіцы ва Улахерне протаіерэем Віктарам Вабішчэвічам. Айцец Віктар расказаў юным наведвальнікам бібліятэкі пра галоўныя праваслаўныя кнігі і значэнне духоўнай літаратуры ў жыцці кожнага чалавека. ”Яна адкрывае нам асаблівы свет, дзе правільна тлумачацца сапраўдныя каштоўнасці і прыярытэты“ – падкрэсліў благачынны. Акрамя таго, у праваслаўнай кнізе можна спазнаць досвед духоўнага ўдасканалення і выхавання. Падчас прэзентацыі дзеці даведаліся пра гісторыю ўзнікнення кнігадрукавання і пра першага беларускага кнігадрукара Ф. Скарыну. На кніжнай выставе *”Духоўных кніг бажэственая мудрасць“* былі прапанаваны як праваслаўныя выданні, так і мастацкая літаратура пра жыццё Ісуса Хрыста і Святой Багародзіцы, пра Анёла Ахоўніка, пра важнасць у жыцці чалавека нацельнага крыжыка.

На базе **Докшыцкай дзіцячай бібліятэкі** працягвае дзейнічаць духоўна-культурны цэнтр *”Добрае слова“*, асноўнай мэтай якога з’яўляецца далучэнне падрастаючага пакалення да агульначалавечых каштоўнасцей. Ён рэгулярна папаўняецца новай літаратурай і

відэаматэрыяламі праваслаўнай тэматыкі. Блок праграмы ”ЛУЧ“ ставіць сваёй мэтай супрацоўніцтва бібліяэкі з праваслаўнай царквой і, безумоўна, духоўна-маральнае выхаванне дзяцей і падлеткаў. На базе бібліятэкі таксама займаецца нядзельная школа прыхода храма Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Значным поспехам справаздачнага года стаў фотавернісаж ”Храму Пакрова Прасвятой Богародзіцы – 120 год“, на якім была адлюстравана гісторыя храма, прадстаўлены матэрыялы пра ўсіх святароў, якія служылі ў ім ад самага пачатку. Адзін з раздзелаў фотавернісажу быў прысвечаны нядзельнай школе.

## Арганізацыя вольнага часу

Арганізацыя летняга адпачынку дзяцей і падлеткаў – традыцыйны кірунак дзейнасці **Чашніцкай раённай дзіцячай бібліятэкі імя Янкі Журбы**. У летнія месяцы з чэрвеня па жнівень 2023 года бібліятэка актыўна працавала над рэалізацыяй праекта летняга чытання *”Летнія чытанні – цікавыя падарожжы і прыгоды – 2023“*. Праект садзейнічаў фарміраванню і пашырэнню кругагляду падрастаючага пакалення, яго інтарэсаў і захапленняў, а таксама мэтанакіраванай арганізацыі чытання і культурнага правядзення вольнага часу. У рамках праекта было праведзена 50 мерапрыемстваў з выкарыстаннем традыцыйных і інтэрактыўных форм работы: гульнявых праграм, квэстаў, пазнавальных гадзін, паэтычных хвілінак, прэзентацый, віртуальных відэапраглядаў. Удзельнікамі мерапрыемстваў сталі 960 чалавек. Пазнавальна-гульнявыя праграмы *”Добры дзень, свята, добры дзень, лета!“*, *”Аранжавае лета“*, *”Па слядах супергрызуноў“* сустрэлі выхаванцаў школьных летніх лагераў рухомымі гульнямі-танцамі, вясёлымі загадкамі, віктарынамі, маляўнічымі кніжнымі выставамі і іншымі цікавымі забаўлянкамі. Бібліятэкары знаёмілі дзяцей з праграмай летніх чытанняў, раздавалі ім маляўнічыя чытацкія дзённікі. А каб адпачынак і лета прыносілі толькі радасць, дзеці атрымалі памяткі па правілах бяспечных паводзін у розных сітуацыях. У рамках святкавання Дня абароны дзяцей, на галоўнай плошчы горада Чашнікі, супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі імя Янкі Журбы прадставілі чытачам тэматычную пляцоўку *”Прывітанне, свята! Прывітанне, лета!“*, падчас якой дзеці змаглі акунуцца ў краіну дзяцінства і казак. Хлопчыкі і дзяўчынкі з задавальненнем удзельнічалі ў пазнавальна-гульнявой праграме *”Аранжавае лета“*, дзе актыўна адказвалі на пытанні фіксі-віктарыны, збіралі вясёлку з рознакаляровых паветраных шароў, прынялі ўдзел у акцыі *”Расшыфруй казку – атрымай размалёўку“*, вырасцілі кветку сяброўства, успомнілі сапраўдных сяброў з кніг, мультфільмаў, кінафільмаў і песень. Жадаючыя змаглі сфатаграфавацца ля выставачнай зоны, выкарыстоўваючы тантамарэску.





Літаратурна-тэатралізаванае свята ”Няхай кніга стане святам для ўсіх“
Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1



Праграма ”Летнія чытанні“
Дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС




”75: союз читателя и книги“
Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога-філіял № 1 Полацкай РЦБС




Абласны конкурс дзіцячых гульнявых праграм ”Задума“
Дзіцячая бібліятэка ДУК ”Верхнядзвінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“



**Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 Талачынскай ЦБС** для сваіх юных чытачоў арганізавала літаратурны аўторак. На працягу трох летніх месяцаў штотыдзень дзеці запрашаліся на *”Літаратурныя сустрэчы на лавачцы“*, дзе слухалі або самастойна чыталі цікавыя і павучальныя апавяданні, прымалі ўдзел у літаратурных і настольных гульнях, конкурсах, разгадвалі крыжаванкі. Падчас мерапрыемстваў праводзіліся агляды літаратуры, дзе хлопчыкі і дзяўчынкі знаёміліся з творчасцю К. Булычова, Ул. Крапівіна, Т. Леванавай, Я. Гаглоева, С. Гоці, Л. Кэррала. У жнівеньскія дні на ”літаратурнай лавачцы“ праводзіліся гучныя чытанні твораў К. Бальмонта ”Першы спас“, В. Брусава ”Тры яблыка“, Б. Пастэрнака ”Жнівень“, І. Буніна ”Антонаўскія яблыкі“, І. Шмялёва ”Яблычны Спас”, В. Нікіфарава-Волгіна ”Яблыкі“. Даспадобы прыйшлася наведвальнікам дэгустацыя кніжных навінак ”Чытаць пададзена. Новыя імёны. Новыя кнігі“.

У верасні месяцы **Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка** правяла бібліяпрыцемкі пад назвай *”Тут жыве царыца ведаў“*, якое наведалі больш за 50 дзяцей і іх бацькоў. На пачатку прысутныя прагледзелі відэапрэзентацыю *”70 лет с детьми и для детей“*. Яна была прысвечана гісторыі стварэння бібліятэкі і найважнейшым яе падзеям. З задавальненнем госці мерапрыемства паўдзельнічалі ў віктарыне *”Что нужно знать о библиотеке?“* і праслухалі відэапажаданні, якія падрыхтавалі супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі для сваіх карыстальнікаў. Для гасцей была падрыхтавана вясёлая гульнявая праграма, якая не пакінула абыякавым ніводнага наведвальніка. Дзеці разам з бацькамі паспрабавалі свае сілы ў гульні-бібліякэшынгу *”В поисках книжных сокровищ“*, паўдзельнічалі ў квэст-гульні *”Путешествие по Книжному океану“*, наведалі літаратурны цір *”Меткий читатель“* і куток творчасці *”Твори! Рисуй! Выдумывай!“*.

22 верасня ў **дзіцячай бібліятэцы імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС** адбылася штогадовая культурна-адукацыйная праграма *”Нясумны вечар у бібліятэцы – 2023“*. У гэтым годзе Нясумны вечар быў прысвечаны гульням і цацкам, якія, безумоўна, любяць і дарослыя, і дзеці. Для прысутных былі прадстаўлены: ”Яга-квэст“, ”Barbie. Вечарынка-караоке“, лялькі-акцёры, ценявы тэатр, арыгамі, аквагрым і вялізная колькасць мяккіх цацак. Выдатны настрой стварылі творчыя калектывы горада. Больш за 450 дзяцей і падлеткаў, бацькоў і педагогаў сталі ўдзельнікамі гэтага цікавага праекта.

## Арганізацыя работы дзіцячых бібліятэк з сацыяльна неабароненымі катэгорыямі насельніцтва

Трэба адзначыць, што большасць мерапрыемстваў было накіравана на далучэнне дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя да розных відаў мастацка-творчай дзейнасці, заахвочвання да маўленчай актыўнасці, развіццё памяці і ўвагі, імкненне больш даведацца аб навакольным свеце.

Бібліятэкары **Пастаўскай дзіцячай бібліятэкі імя У. Дубоўкі** цесна супрацоўнічаюць з Сацыяльна-педагагічным цэнтрам Пастаўскага раёна і прапануюць яго наведвалікам прыняць удзел у мерапрыемствах. Так, для дзяцей цэнтра было праведзена літаратурна-гульнявое падарожжа *”Самая найпрыгажэйшая ў свеце“*. Мерапрыемства было прысвечана роднай мове. Удзельнікі адгадвалі загадкі, вучылі ветлівыя словы на беларускай мове, рабілі моўную размінку і глядзелі беларускія мультфільмы. Падчас пазнавальнай гульні *”Если хочешь быть здоровым“* дзеці вандравалі на паравозіку па горадзе Здароўя, адгадвалі загадкі , абмяркоўвалі карысную і шкодную ежу, рабілі спартыўную размінку.

Юныя чытачы **бібліятэкі-філіяла № 14 імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска**, якія займаюцца ў гуртку ”Бусляня“, далучыліся да акцыі Кастрычніцкага раённага камітэта ГА ”БРСМ“ г. Віцебска *”Анёл дабрыні“*. Пяцігадоваму Арцёму, выхаванцу дзіцячага дома, падарылі анёла, створанага рукамі гурткоўцаў, а таксама прыналежнасці для малявання, кнігі, цацкі, садавіну. Акцыя атрымала благаслаўленне кіраўніка Епархіяльнага аддзела па ўзаемадзеянні з Узброенымі Сіламі і праваахоўнымі органамі настаяцеля храма Святога Прарока Ільі протаіерэя Аляксандра Мазалёва і мела працяг для іншых хворых дзяцей, якія не маюць бацькоў.

**Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1 Полацкай РЦБС** цесна супрацоўнічае з аддзяленнем сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў ДУ ”Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Полацкага раёна“, якое наведваюць дзеці і дарослыя. Для наведвальнікаў аддзялення супрацоўнікі бібліятэкі правялі літаратурна-гістарычную гадзіну *”...И превратились в белых журавлей“*, прысвечаную 100-годдзю з дня нараджэння Р. Гамзатава. Прысутныя даведаліся, як просты хлопчык з горнага дагестанскага сяла стаў паэтам, якія ім напісаны выдатныя вершы пра Радзіму, родны край, каханне і сяброўства, і які вялікі ўклад ён унёс у савецкую літаратуру. Асаблівая ўвага была нададзена песні ”Жураўлі“, якая прысвячалася ваеннай тэматыцы. Пасля аповеду наведвальнікам быў прапанаваны майстар-клас у тэхніцы арыгамі. Яны вырабілі з белай паперы жураўлікаў, што было вельмі сімвалічна і адпавядала тэме мерапрыемства.



## САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ. ФОТАФАКТ



”Лепшая дзіцячая бібліятэка“ па выніках работы за 2022 год
Раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі Пастаўскай ЦБС


”70-гадоў льецца бібліятэчнае святло“
Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Лепельскай ЦБС